Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 МАЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 94 (28204) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Як вырасціць добры ўраджай?**

СТАР. 4



**Маркетынг — цэлая навука**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Васіль ЖАРКО,**
**міністр аховы здароўя:**

*«На сёння ў краіне налічваецца больш як 36,6 тысячы практыкуючых урачоў. Укамплектаванасць урачэбных пасад у сярэднім па рэспубліцы склала 97 працэнтаў. На 1 студзеня 2016 года вакантнымі заставаліся 2612 ставак урачоў-спецыялістаў і 4095 ставак сярэдняга медперсаналу. Тут неабходна ўлічваць, што ў працэсе працоўнай дзейнасці медыцынскія работнікі могуць ісці ў сацыяльны водпуск па доглядзе дзіцяці да трох гадоў, працоўныя водпускі, адсутнічаць на рабочым месцы ў выніку працяглай хваробы, што прыводзіць да часовага дэфіцыту кадраў у кожнай канкрэтнай установе. У 2017 годзе ўсе вакантныя месцы будуць заняты».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.05.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 19592,00 ▲ |
| Еўра | 21992,00 ▲ |
| Рас. руб. | 296,02 ▼ |
| Укр. грыўня | 775,61 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Профі

# РАБОЧАЯ АРЫСТАКРАТЫЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Пагрозу «Не хочаш працаваць галавой, будзеш працаваць рукамі» чулі, напэўна, многія школьнікі. ІІ нацыянальны чэмпіянат прафесійнага майстэрства WorldSkills Belarus разбурыў стэрэатып пра нізкую кваліфікацыю прадстаўнікоў рабочых прафесій ушчэнт. На тры дні Футбольны манеж у сталіцы пераўтварыўся ў адну вялікую майстэрню, дзе сабраліся зваршчыкі і муляры, фрэзероўшчыкі і токары, плітачнікі і сталяры, цырульнікі і дызайнеры адзення, кухары і кандытары, сеткавыя адміністратары і мехатронікі, аўтамеханікі і афіцыянты, каб паказаць свае прафесійныя навыкі і ўменне працаваць на самым сучасным абсталяванні.**

Фіналісты WorldSkills Belarus-2016 дэманстравалі майстэрства ў 33 рабочых кампетэнцыях. У параўнанні з першым чэмпіянатам, у праграму дабавілася 11 новых кампетэнцый: выраб мэблі, цяслярскія, электрамантажныя, малярныя і дэкаратыўныя работы, сухое будаўніцтва і тынкаванне, сантэхніка і ацяпленне, тэхніка халадзільных установак і кандыцыянавання паветра, графічны дызайн, праграмнае забеспячэнне для бізнесу, вэб-дызайн і кузаўны рамонт аўтамабіля. Плюс чатыры дэманстрацыйныя кампетэнцыі: візуальны мерчандайзінг і афармленне вітрын, выпечка хлебабулачных вырабаў, касметалогія, медыка-санітарная дапамога і сацыяльны догляд.

Акрамя беларускіх канкурсантаў, удзел у нацыянальным чэмпіянаце ўзялі таксама прадстаўнікі Расіі, Казахстана, Украіны, Фінляндыі, Швейцарыі і Рэспублікі Карэя. Гэта звычайная практыка, калі замежнікі ўдзельнічаюць у «чужых» спаборніцтвах, каб і на іншых паглядзець, і сябе паказаць, а за адным махам параўнаць уласнае прафесійнае майстэрства з майстэрствам патэнцыяльных сапернікаў на сусветным чэмпіянаце. Па выніках правядзення рэспубліканскага конкурсу будзе сфарміравана нацыянальная зборная, якая ў кастрычніку 2017 года прадставіць Беларусь на 44-м міжнародным чэмпіянаце WorldSkills Competition у Абу-Дабі (ААЭ).

Працу канкурсантаў ацэньвалі больш за 230 суддзяў, сярод якіх акрэдытаваныя эксперты WorldSkills International. Больш за тое, паназіраць за нашымі спецыялістамі ў рабоце прыехалі прадстаўнікі 23 краін: Вялікабрытаніі, Германіі, Літвы, Польшчы і іншых. У тым ліку тых, якія яшчэ толькі думаюць далучыцца да сусветнага руху WorldSkills, як, напрыклад, Пакістан.

СТАР. 3

■ Наш дом

## НЕ ЎМЕЮЦЬ? ЦІ НЕ ХОЧУЦЬ?

**Дзейнасць сістэмы ЖКГ павінна быць празрыстай, а расцэнкі рэальнымі. Нядаўна па даручэнні кіраўніка дзяржавы былі праведзены адпаведныя праверкі ў гэтай сферы. Знойдзена мноства парушэнняў, вінаватых прыцягваюць да адказнасці. Сярод паслуг, якія камунальныя службы аказваюць насельніцтву, — вываз смецця. Апошняе трэба не толькі даставіць на сметнік. Самае каштоўнае з адходаў трэба літаральна пераўтварыць у даходы. У многіх краінах свету так і робіцца. Чаму ў нас пакуль што, перафразуючы вядомага палітыка, «працэс не пайшоў»? Так, нешта робіцца. Але не вельмі плённа. «Смеццевую» тэму вывучаў карэспандэнт «Звязды».**

### Мясцовыя ўлады самаўхіліліся

— Кожны год на збор, сартаванне адходаў выдаткоўваюцца мільярды рублёў бюджэтных грошай. Велізарныя сумы. Дзяржаўная палітыка па абыходжанні з адходамі вызначана адпаведным законам. Яна накіравана на зняменшэнне зняшаных адходаў пры павелічэнні збору з іх другасных матэрыяльных рэсурсаў. Мы не настолькі багатыя, каб выкідаць тое, што можна перарабляць. Гэта сыравіна і загрузка для перапрацоўчых прадпрыемстваў, — канстатуе **Вадзім ЗАРАНКІН, старшыня Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці.**

Яго падначаленыя зрабілі сумную выснову: мясцовыя органы ўлады, у кампетэнцыю якіх уваходзіць арганізацыя працы па выдаленні камунальных адходаў, ад рашэння гэтага пытання самаўхіліліся. У прыватнасці, не было карэкцыроўкі дыферэнцаваных тарыфаў назапашвання адходаў у бок зняменшэння. А «арыфметычныя памылкі» кампенсаваліся грамадзянамі і з бюджэту.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!
Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# АСАБЛІВАЯ АДКАЗНАСЦЬ ЗА БЯСПЕКУ

**Асноўныя пагрозы бяспекі, з якімі сутыкаецца Садружнасць Незалежных Дзяржаў, і крокі для больш эфектыўнага супрацьстаяння гэтым выклікам абмяркоўваліся на сустрэчы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з кіраўнікамі дэлегацый 40-га пасяджэння Савета кіраўнікоў органаў бяспекі і спецыяльных службаў дзяржаў — удзельніц СНД.**

Удзельнікі сустрэчы закранулі праблему ўзмацнення міжнароднай напружанасці, нарошчвання ваеннай прысутнасці НАТО на тэрыторыі Усходняй Еўропы, у тым ліку каля межаў Беларусі. «Вобласць нестабільнасці вакол нас, на жаль, пашыраецца. Прыходзіцца канстатаваць размыванне механізмаў забеспячэння як міжнароднай, так і рэгіянальнай бяспекі. Асобныя знешнія палітычныя сілы дэманструюць вяртанне да блокавага мыслення часоў «халоднай вайны». У наяўнасці спробы ўцягвання цэлых рэгіёнаў у супрацьстаянне і новую гонку ўзбраенняў. Для нас гэта абсалютна непрымальна», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Абмяркоўваўся таксама міграцыйны крызіс у Еўропе, якая з-за нестабільнасці на Блізкім Усходзе перажывае сапраўдную гуманітарную катастрофу, паведамляе прэс-служба Кіраўніка дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што праблему нелегальнай міграцыі Беларусь у адзіночку вырашае не менш за 10 гадоў. «Мы з гэтай праблемай знаёмыя даўно, у нас ёсць пэўны вопыт работы ў гэтым напрамку, але ў адзіночку Беларусь, у тым ліку і матэрыяльна, справіцца не можа», — сказаў Кіраўнік дзяржавы. У час сустрэчы выявілася заклапочанасць, што ў сувязі з узмацненнем жорсткасці міграцыйнага кантролю на межах краін ЕС нагрузка на Беларусь можа яшчэ больш узрасці.

У СНД усведамляюць рэальную пагрозу, якую ўяўляе для яго краін пагаршэнне міграцыйнага становішча ў Еўропе, узмацненне крызісных з'яў у сусветнай эканоміцы, абвастрэнне барацьбы за энергетычныя, водныя, іншыя рэсурсы. «На гэтай глебе падымае галаву радыкальны экстрэмізм, нарастаюць пагрозы з боку міжнародных тэрарыстычных структур. Таксама на парадку дня стаяць праблемы транснацыянальнай злачыннасці, наркатрафіку, гандлю людзьмі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Усё гэта ўскладае асаблівую адказнасць на органы дзяржаўнай бяспекі і спецыяльныя службы дзяржаў Садружнасці.

Разам з тым кіраўнік дзяржавы заклікаў больш адкрыта абмяркоўваць вострыя ўнутраныя праблемы СНД: сітуацыю ў Прыднястроўі, Нагорным Карабаху, Украіне. «Калі мы іх не будзем бачыць, лячыць гэтыя хваробы, мы загонім іх углыб», — перасцярог Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што СНД неабходна імкнуцца да дыялогу па гэтых і іншых актуальных пытаннях. «Трэба дамаўляцца. Мы нікуды не падзенемся, мы ў адной лодцы, ніхто нас асабліва там, на іншых берагах, не чакае. Трэба ўладкоўваць сваё жыццё», — сказаў Кіраўнік дзяржавы. Палітыка Беларусі ў галіне бяспекі сёння такая, каб трымаць порах сухім, абапіраючыся на партнёраў. Удзельнікі сустрэчы сышліся ў думцы, што такой сёння павінна быць агульная пазіцыя.

Закранаючы тэму мадэрнізацыі СНД, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў важнасць развіцця Садружнасці як унікальнай інтэграцыйнай і перамоўнай пляцоўкі. Прэзідэнт адзначыў, што лічыць магчымым вяртанне Грузіі і Украіны да ўзаемадзеяння ў рамках Садружнасці.

У час сустрэчы былі закрануты шэраг іншых тэм, актуальных для органаў бяспекі і спецслужбаў СНД. У тым ліку меры па супрацьдзеянні міжнароднаму тэрарызму і экстрэмізму, арганізацыі сумеснай сістэмнай працы па гэтым і астатніх напрамках узаемадзеяння.

■ Трагедыя

# Перарваны палёт рэйса MS804

**Самалёт егіпецкай авіякампаніі EgyptAir, які ляцеў з Парыжа ў Каір, учора пацярпеў крушэнне на поўдні ад грэчаскага вострава Карпатас, паведаміла агенцтва «Рэйтэр» са спасылкай на грэчаскае тэлебачанне.**

Са сталіцы Францыі самалёт вылецеў у 23:09 па парыжскім часе, а да месца прызначэння ён павінен быў прыбыць у 03:05 па каірскім. Рэйс MS804 знік з радараў у чацвер ноччу — праз дваццаць хвілін пасля таго, як зайшоў у паветраную прастору Грэцыі. Таксама стала вядома, што незадоўга да знікнення з радараў дыспетчараў лайнер Airbus A320 паспеў увайсці ў паветраную прастору Егіпта на 10 міль. Сувязь з ім абарвалася падчас палёту на вышыні каля 11 тысяч метраў. Міністр абароны Грэцыі заявіў, што перад знікненнем лайнер зрабіў нечаканы рэзкі паварот. Паводле апошніх звестак, на борце знаходзіліся 66 грамадзян з 12 краін, а таксама члены экіпажа. Як адзначылі ў Міністэрстве замежных спраў Беларусі, жыхароў нашай краіны на борце не было.

Самалёт Airbus A320 падчас крушэння быў у зоне адказнасці егіпецкіх дыспетчараў. Улады Грэцыі абвясцілі забарону для палётаў у зоне над тэрыторыяй крушэння. На прэс-канферэнцыі Прэзідэнта Францыі Франсуа Аланда, разглядаюцца ўсе магчымыя версіі здарэння. Дырэктар ФСБ Расіі Аляксандр Бортнікаў падчас пасяджэння Савета кіраўнікоў органаў бяспекі і спецслужбаў СНД выказаў думку, што катастрофа егіпецкага самалёта A320 была тэрарыстычным актам.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні прэзідэнту Егіпта Абдэль Фатаху Саіду Хусейну Халілу аль-Сісі, прэзідэнту Францыі Франсуа Аланду, егіпецкаму і французскаму народам, родным і блізкім загінуўшых у авіякатастрофе самалёта, які выконваў рэйс па маршруце Парыж—Каір.**

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■

V Усебеларускі народны сход

# ЯНЫ ВЫЗНАЧАЦЬ КУРС КРАІНЫ

Дзевяноста гамяльчан выбраны дэлегатамі на пяты Усебеларускі народны сход. Сваіх прадстаўнікоў ужо назвалі горад над Сожам, Буда-Кашалёўскі, Гомельскі, Нараўлянскі, Рэчыцкі, Жыткавіцкі, Петрыкаўскі, Калінкавіцкі і Мазырскі раёны. Усяго рэгіён на форуме ад вобласці прадставіць 350 чалавек. Гэта прадстаўнікі розных слаёў насельніцтва і самых розных прафесій, якія карыстаюцца аўтарытэтам і павагай у сваіх калектывах. Амаль тысяча ўпаўнаважаных прыйшлі ў залу Гомельскага палаца чыгуначнікаў, каб выбраць дэлегатаў на ўсенародны форум.

— Гомель, нягледзячы на пэўныя цяжкасці, дасягнуў некаторых поспехаў, — адзначае **старшыня Гомельскага гарвыканкама Пётр КІРЫЧЭНКА.** — З 2011-га па 2015 год аб'ём прамысловай прадукцыі меў станоўчую дынаміку росту. Прадпрыемствамі горада экспартавана тавараў амаль на $15 млрд пры тэмпе роста 185%. З 2011 года ў эканоміку горада прыцягнута больш Br23 трл інвестыцый (звыш $2 млрд). Будзе развівацца эканоміка — будуць развівацца і ўсе астатнія сферы. Гэты год павінен стаць пераломным у пераадоленні негатыўных тэндэнцый у эканоміцы. Складанасць задач патрабуе ад усіх плённай працы, рэалізацыі новых падыходаў, дасягнення якасных вынікаў кожнага на сваім працоўным месцы. Таму перад удзельнікамі народнага сходу стаяць важныя задачы. Трэба вызначыць курс сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на наступныя 5 гадоў.

Ад рашэнняў, якія прымуць дэлегаты, будзе залежыць фарміраванне будучыні, знешняга і ўнутрыпалітычнага курсу краіны. Кіраўнікі буйных прадпрыемстваў: урачы, педагогі, спартсмены, кіраўнікі ўстаноў і арганізацый — усе атрымалі аднагалосную падтрымку. Напярэдадні — падрыхтоўка да ўсенароднага форуму. Дэлегаты будуць вызначаць прыярытэты на наступнае пяцігоддзе, гаворыць **дэлегат Пятага Усебеларускага народнага сходу Алена АСТАПЮК,** якая з'яўляецца сёння і дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:

— Я чалавек ад аховы здароўя і аддала ёй шмат гадоў. Вядома ж, жадаю, каб палепшылася матэрыяльна-тэхнічная база першаснага звяна — нашых паліклінік. Трэба ліквідаваць чэргі. Таму абсталяванне паліклінік — на першым месцы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Прамая лінія

# УСЁ ПРА ПЕНСІІ

**Ці павялічыцца перадпенсійны ўзрост, у якім працадаўца не мае права не падоўжыць кантракт? Калі будуць выходзіць на пенсію вайскоўцы і міліцыянеры? Якая выслуга гадоў будзе патрэбна дзяржслужачым? На гэтыя і іншыя пытанні нашым чытачам адказалі падчас «прамой лініі», якая адбылася ў «Звяздзе» 19 мая, спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны — начальнік упраўлення арганізацыі пенсійнага забеспячэння Алена ДРОНАВА і кансультант упраўлення пенсійнага заканадаўства Аляксандра САМАДУМСКАЯ.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

На гадзінніку роўна 11 гадзін, і тут жа раздаецца першы званок.

*— Гэта Таццяна Мікалаеўна Лук'яненка. Я жыву ў Жлобінскім раёне, у вёсцы Пярэвічы, сама 1964 года нараджэння, нарадзілася ў маі. Цяпер у мяне перадпенсійны ўзрост. Я два апошнія гады не працавала, даглядала інваліда другой групы, гэта значыць, што страхавыя ўнёскі не плаціліся. Мяне цікавіць, якую пенсію я буду атрымліваць...*

— З улікам Указа Прэзідэнта ад 11 красавіка 2016 года №137 «Аб удасканаленні пенсійнага забеспячэння», павышаецца агульнаўстаноўлены пенсійны ўзрост, пачынаючы з 1 студзеня 2017 года. Права на пенсію па ўзросце вы будзеце мець, калі вам споўніцца 57 з паловай гадоў, гэта значыць у лістападзе 2021 года. Для вызначэння права на гэтую пенсію ў 2021 годзе вам будзе неабходны страхавы стаж не менш за 18 гадоў.

*— У мяне на сённяшні дзень 35 гадоў працоўнага стажу ўжо ёсць. Але частка яго прыпадае на час СССР. Я працавала ў школе-інтэрнаце і ў сярэдняй школе, а ў 2014 годзе звольнілася. У мяне ішоў бесперапынны стаж з 1981 года, адразу як закончыла школу...*

— Таццяна Мікалаеўна, у гэты так званы страхавы стаж уключаюцца і перыяды працы ў час СССР. Я думаю, калі вы працавалі з 80-х гадоў мінулага стагоддзя і да 2014 года без перапынку ў працоўнай дзейнасці, то ў вас павінен быць напрацаваны 18-гадовы страхавы стаж. Але, каб вы не сумняваліся, мы рэкамендуем вам звярнуцца з працоўнай кніжкай ва ўпраўленне сацыяльнай абароны, каб там спецыяліст паглядзеў усе вашы дакументы і канкрэтна ўсё сказаў па вашым выпадку.

***

*— Ліёненка Надзея Міхайлаўна з Мінска вас турбуе. Я тэлефаную наконт свайго мужа. Ён працуе ў транспартнай кампаніі. Яго арганізацыя ліквідуецца, як сказалі, да 1 ліпеня. А яму 23 лістапада спаўняецца 60 гадоў. Як яму быць з пенсіяй? Можа, ужо сёння можна звярнуцца ва ўпраўленне сацыяльнай абароны па яе назначэнне? На яго прадпрыемстве яму ніхто афармляць пенсію не будзе, там ужо няма аддзела кадраў.*

— Надзея Міхайлаўна, артыкулам 24 «Закона аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь» прадугледжана датэрміновае прызначэнне пенсіі не больш чым за год да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту. Але для гэтага неабходна выкананне некаторых умоў, адна з якіх — мець права на дапамогу па беспрацоўі на працягу 52 каляндарных тыдняў (якая прадастаўляецца мужчынам, што маюць працоўны стаж не менш 38 гадоў). Пры гэтым пенсія назначаецца па прапанове службы занятасці пры адсутнасці магчымасці працаўладкавання. Скажыце, у вашага мужа ёсць 38 гадоў працоўнага стажу?

*— Працоўны стаж у яго 45 гадоў.*

— Добра, значыць, гэтая ўмова таксама выконваецца. Звяртаю вашу ўвагу на наступнае: калі ваш муж будзе звольнены ў сувязі з ліквідацыяй прадпрыемства, то датэрміновая пенсія можа быць прызначана незалежна ад права на такую дапамогу. Пасля звальнення ваш муж павінен звярнуцца ў службу занятасці, яго там зарэгіструюць, і калі не змогуць працаўладкаваць, то прапануюць датэрмінова прызначыць пенсію. Яшчэ раз паўтару: усе гэтыя пытанні вырашаюцца праз службу занятасці.

*— Скажыце, а хто яму будзе збіраць неабходныя даведкі? Ці ён павінен будзе рабіць усё сам?*

— Калі ён будзе звольнены на дату звяртання па прызначэнне пенсіі, то павінен будзе сам займацца гэтым пытаннем. Калі ўзнікнуць нейкія перашкоды, ваш муж можа звярнуцца ва ўпраўленне сацыяльнай абароны, дзе яму акажуць садзейнічанне ў выпатрабаванні дакументаў, а таксама пры неабходнасці дадаткова пракансультуюць.

***(Працяг «Прамой лініі» чытайце ў наступных нумарах «Звязды».)***

**Святлана БУСЬКО**

■

■ Узровень

# ВЫМЯРЭННІ Ў ДЫНАМІЧНЫМ СВЕЦЕ

**Пад такім дэвізам праходзіць сёлета Сусветны дзень метралогіі**

**20 мая беларускія метролагі разам з сусветнай метралагічнай супольнасцю адзначаюць Сусветны дзень метралогіі. Як адзначаюць у Дзяржстандарце, сёння наша краіна мае эфектыўную метралагічную інфраструктуру, якая карыстаецца міжнародным прызнаннем. У склад Дзяржаўнай метралагічнай службы ўваходзяць Нацыянальны метралагічны інстытут — Беларускі дзяржаўны інстытут метралогіі (БелДІМ) і 15 тэрытарыяльных цэнтраў стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі.**

Аснову для інавацый у навуцы і прамысловасці закладвае сучаснае вымяральнае і выпрабавальнае абсталяванне і створаная ў рэспубліцы эталонная база. «Яна ўключае 53 дзяржаўныя эталоны і будзе нарошчвацца з улікам пашырэння тэхнічнага патэнцыялу краіны. Эталоны ўзнаўляюць значэнні асноўных адзінак — даўжыні, масы, часу і частаты, тэмпературы, сілы святла, а таксама іншых адзінак у галіне фізіка-хімічных, аптычных, акустычных, электрычных, радыёэлектронных велічынь, вымярэнняў ціску і расходу, іанізуючых выпраменьванняў», — патлумачылі ў прэс-службе Дзяржстандарта.

— Можна з упэўненасцю канстатаваць, што дакладнасць нашых нацыянальных эталонаў у поўнай меры адпавядае міжнародным патрабаванням. Эталоны праходзяць міжнародныя параўнанні з эталонамі іншых краін, што забяспечвае ім прызнанне на сусветным узроўні, — падкрэслілі ў Дзяржстандарце.

Асаблівая ўвага сёння — да развіцця атамнай энергетыкі і звязаных з ёй тэхналогій, развіцця беларускай інфраструктуры ў сферы інфармацыйных тэхналогій, электроннай дыверсіфікацыі, абароны інфармацыі. Для забеспячэння высокадакладнымі вымярэннямі розных галін прамысловасці, будаўніцтва і сельскай гаспадаркі, стварэння новых матэрыялаў будуць створаны нацыянальныя эталоны адзінак цвёрдасці, ціску, цеплавога патоку і спатрэбіцца мадэрнізацыя эталона адзінкі масы. У Дзяржстандарце таксама дадалі, што ўзмацняецца ўвага і да пытанняў нацыянальнай бяспекі, абароны ад надзвычайных сітуацый і геадэзіі. «У гэтай рабоце варта асабліва адзначыць распрацоўку эталона адзінкі даўжыні — метра ў галіне вялікіх даўжынь. У рэспубліцы няма такога эталона, а без гэтага займацца геадэзіяй і GPS-навігацыяй практычна немагчыма».

Акрамя таго, будуць працягнуты работы і па стварэнні эталонаў, якія дазваляюць павысіць якасць медыцынскіх паслуг і забяспечыць неабходныя ўмовы для ацэнкі якасці асяроддзя пражывання.

«Вельмі важна, што ўсе эталоны, якія ствараюцца, адпавядаюць перспектыўным напрамкам навукова-тэхнічнага развіцця, задачам органаў дзяржаўнага кіравання, патрэбам прадпрыемстваў і будуць спрыяць пераходу на 6, 7-ы ўклад тэхналагічнага ўзроўню нашай прадукцыі», — падкрэслілі ў Дзяржстандарце.

**Дар'я ШОЦІК**

■

## НА АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ — КАНКРЭТНЫЯ АДКАЗЫ

### Прамыя тэлефонныя лініі працягваюцца

Пачынаючы з сярэдзіны студзеня 2015 года, міністры, кіраўнікі аблвыканкамаў, мэры і іх намеснікі ўжо адказалі на тысячы пытанняў і далі сотні даручэнняў адказным органам. Патэлефанаваўшы на «прамую лінію», грамадзяне заўсёды могуць разлічваць на тое, што іх зварот будзе разгледжаны.

**У гэтую суботу, 21 мая, з 9.00 да 12.00 на сувязь выйдуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў АШМЯНЦАЎ Сяргей Дзмітрыевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ГРАБНЁЎ Генадзь Іванавіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў БАРЫСЕНКА Алег Леанідавіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні НЕКРАШЭВІЧ Уладзімір Віктаравіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні МАКАР Ігар Мікалаевіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні Бірыч Жанна Эдуардаўна (80172224444).

■ Надвор'е

# ПАРЫВІСТЫ ВЕЦЕР І ДАЖДЖЫ

### А ў нядзелю на поўдні чакаецца да плюс 25 градусаў

Сёння ўсходняя палова краіны трапіць пад уплыў актыўных франтальных раздзелаў, а на астатняй тэрыторыі будзе гаспадарыць зона павышанага атмасфернага ціску. Таму чакаецца воблачна, па захадзе з праясненнямі, а пераважна па ўсходняй палове краіны пройдуць дажджы, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.

Сіноптыкі папярэджваюць, што ўдзень у пятніцу ва ўсходніх раёнах чакаюцца працяглыя моцныя дажджы. Вецер паўночна-заходні ўмераны, па ўсходзе краіны — моцны парывісты. Максімальная тэмпература паветра складзе плюс 10—16 градусаў, а па захадзе — да 17—20 цяпла. І далей у выхадныя спецыялісты прагназуюць няўстойлівае надвор'е.

Ужо ў суботу тэрыторыя Беларусі трапіць пад уплыў цыклону, які перамяшчаецца праз Бранскую і Смаленскую вобласці на паўночны захад еўрапейскай часткі Расіі. Уначы на суботу пераважна па ўсходняй палове, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Па паўночным усходзе ў асобных раёнах — моцныя дажджы. Удзень месцамі прагрымяць навальніцы. У асобных раёнах чакаецца моцны парывісты вецер. Мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе плюс 4—11 градусаў, а максімальная ўдзень — 16—23 цяпла, аднак па паўночным усходзе яна не перавысіць плюс 11—15 градусаў.

У нядзелю надвор'е будзе вызначаць зона паніжанага атмасфернага ціску. У асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 4 да 10 цяпла, а ўдзень — ад плюс 16 да плюс 23 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны паветра прагрэецца да 25 цяпла.

### АГРАРЫІ ЧАКАЮЦЬ ЦЯПЛА

У сярэдзіне мая ў сувязі з усталяваннем халоднага надвор'я некалькі пагоршыліся ўмовы для з'яўлення ўсходаў і далейшага развіцця цеплалюбівых культур. Сярэдняя тэмпература глебы на глыбіні 10 см складала ў асноўным 11—14 цяпла. Сіноптыкі адзначаюць, што такі тэмпературны рэжым ніжэйшы за аптымальны для прарастання збожжа і з'яўлення ўсходаў цеплалюбівых культур, у прыватнасці кукурузы. Уначы на паверхні глебы і на вышыні да 2 см месцамі адзначаліся слабыя замаразкі. Мінусавая тэмпература не дасягала небяспечнага ўзроўню, але зніжала тэмпы развіцця цеплалюбівых культур.

Паводле апошніх звестак, на асноўных масівах кукурузы назіраюцца ўсходы. У паўднёвай палове краіны на красавіцкіх пасевах з'явіўся 3-ці ліст. На плошчах, засеяных пасля 10 мая, у кукурузы адзначаецца прарастанне зярнят. Верхні 10-сантыметровы пласт глебы знаходзіцца ў асноўным ва ўмерана вільготным стане. Аднак з-за нераўнамернага размеркавання ападкаў у шэрагу раёнаў назіраецца слабае ўвільгатненне верхняга пласта глебы, што так-



сама ўскладняе ўмовы для з'яўлення ўсходаў цеплалюбівых культур. У найбліжэйшыя дні запасы глебавай вільгаці папоўняцца галоўным чынам на ўсходняй частцы Беларусі. У сувязі з павышэннем тэмпературы ў апошняй дэкадзе мая, якое прагназуецца, палепшыцца і цеплазабеспячэнне культур, паведамляюць аграсіноптыкі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by* ■

## ПАДПІСКА-2016
## «ЗВЯЗДА» ПОБАЧ З ЧЫТАЧАМІ

Мы заўжды імкнёмся да таго, каб быць у курсе жыццёвых навін нашых чытачоў. Пры неабходнасці дапамагчы, падзяліць радасць, ды і ўвогуле як мага больш даведацца пра тое, чым дыхаюць розныя куткі роднай Беларусі. Ну не з кабінета ж гэта рабіць, тым больш — вясна.

Таму зноў едзем да вас, нашы чытачы. Працягваем ладзіць сустрэчы ў розных рэгіёнах краіны. Пачынаем з прыгожага, адметнага, сонечнага Маладзечна. **Сёння з 11 да 14 гадзін супрацоўнікі «Звязды» чакаюць сваіх чытачоў і тых, хто імкнецца далучыцца да звяздоўскай суполкі, на раённым вузле паштовай сувязі.**

**Прыходзьце — будзе цікава!**

# Не пашкадавалі нават жыцця

**Памятны знак з імёнамі супрацоўнікаў раённага адзела ўнутраных спраў, якія загінулі пры выкананні службовага і воінскага абавязку, адкрыўся ў Касцюковічах падчас урачыстага мерапрыемства, прысвечанага Дню магілёўскай міліцыі.**

На памятным знаку — імёны пяцярых міліцыянераў. Яны сталі сімвалам мужнасці і адданасці сваёй нялёгкай службе. Захара Брылёва не стала ў чэрвені 1941 года — яго жыццё абарвалася на фронце падчас Вялікай Айчыннай вайны. Пры затрыманні бандыцкай групы ў верасні 1946-га загінулі лейтэнант міліцыі Міхаіл Лістападаў, сяржант Дзмітрый Захараў і ўчастковы ўпаўнаважаны Аляксей Янюцін. А 31 ліпеня 1986 капітана міліцыі Васіля Ярмачэнку, дзяжурнага Касцюковіцкага РАУС, застрэліў псіхічна хворы злачынец, які, узброіўшыся двухствольнай стрэльбай, замкнуўся ў доме з васьмігадовым сынам. Пасмяротна Васіль Ярмачэнка быў узнагароджаны Ордэнам Чырвонай Зоркі.

Ідэя ўстаноўкі памятнага знака належыць начальніку Чэрыкаўскага РАУС падпалкоўніку міліцыі Аляксандру Шункевічу (у мінулым начальніку Касцюковіцкага РАУС) і старшыні ветэранскай арганізацыі РАУС маёру міліцыі ў адстаўцы Уладзіміру Арцюхову.

У мітынгу прынялі ўдзел прадстаўнікі кіраўніцтва УУС вобласці, гарадскіх і раённых аддзелаў, рэспубліканскага савета ветэранаў.

— У самых складаных сітуацыях, грэбуючы небяспекай, не патрабуючы падзякі, ахвяруючы сваім часам і здароўем, а нярэдка і жыццём, супрацоўнікі міліцыі прыходзілі і прыходзяць на дапамогу людзям, захоўваючы ў іх веру ў справядлівасць, — звярнуўся да сваіх калег і ветэранаў **начальнік Магілёўскага УУС Аляксандр КАВАЛЬЧУК.** — Ваша стаўленне да службы было і застаецца прыкладам вернасці абавязку і прысязе. Амаль 100-гадовая гісторыя беларускай міліцыі з усёй відавочнасцю пераконвае нас у гэтым. Сёння асабісты склад органаў унутраных спраў вобласці годна працягвае слаўныя баявыя і прафесійныя традыцыі старэйшых пакаленняў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# РАБОЧАЯ АРЫСТАКРАТЫЯ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Ганаровым госцем конкурсу стаў **прэзідэнт WorldSkills International (WSI) Сайман БАРТЛІ.**

— Я прыехаў у Беларусь, каб перадаць прывітанне ад вялікай сям'і WorldSkills, якая аб'ядноўвае ўжо 75 краін, — паведаміў ён. — WorldSkills — гэта не проста спаборніцтвы. Такі фармат выкарыстоўваецца для таго, каб дапамагчы краінам павысіць якасць і ўзровень прафесійных кампетэнцый моладзі, прадукцыйнасць працы, а ў выніку забяспечыць эканамічны рост. Для моладзі важна ўдзельнічаць у падобных спаборніцтвах і атрымліваць узнагароды. Але яшчэ больш важна, што, вяртаючыся ў свае навучальныя ўстановы, на вытворчасць, у свае кампаніі, яны прывозяць туды апошнюю інфармацыю аб тым, як можна ўдасканальваць прафесійнае майстэрства. Сапраўдны прыз для ўдзельніка чэмпіянату — гэта новы змест падрыхтоўкі і інавацыйныя навыкі, якія істотна апярэджваюць час. Усё гэта дае ім шанцы на лепшае працаўладкаванне і хуткі кар'ерны рост. Гэта, я лічу, галоўная перавага канкурсантаў. Усе яны — сапраўдныя героі, таму што для таго, каб трапіць сюды і сапернічаць у фінале з самымі лепшымі, ім даволіся ўзмоцнена рыхтавацца.

Сайман Бартлі расказаў, што рух WorldSkills зарадзіўся напрыканцы 40-х гадоў мінулага стагоддзя ў Іспаніі, дзе ўрад быў занепакоены вялікім беспрацоўем сярод моладзі і нізкай вытворчасцю працы. Тады і з'явілася ідэя праводзіць спаборніцтвы сярод моладзі, каб параўнаць, як у розных краінах вучаць тым ці іншым навыкам, а таксама пераканаць бацькоў і выкладчыкаў школ, што прафесійная адукацыя і тэхнічная праца вартыя большай увагі. У Еўропе, як і ў Беларусі, на працягу вельмі вялікага адрэзку часу моладзь пераконвалі ў тым, што ўніверсітэт — гэта добра, а прафесійны каледж — дрэнна. Таму сёння патрабуецца вялікая работа з бацькамі і настаўнікамі школ, каб пераканаць іх у адваротным. Рабочым прафесіям не хапае прэстыжу, і над гэтым трэба працаваць...

> **Сучасны рабочы — гэта эрудзіраваны, высокакваліфікаваны спецыяліст, які, акрамя прафесійных ведаў, павінен валодаць спецыфічнымі навыкамі ў сумежных галінах, у тым ліку разбірацца ў інфармацыйных тэхналогіях, робататэхніцы і г.д.**

**Міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ** спадзяецца, што гэты псіхалагічны момант удасца пераадолець, і, улічваючы прагматычнасць нашай моладзі, праз некалькі гадоў будзе стаяць ужо праблема па прыцягненні моладзі ў ВНУ, а не ў прафесійныя каледжы. Моладзь павінна зразумець: галоўнае — стаць прафесіяналам і цалкам сябе рэалізаваць, а зусім не пагоня за дыпломам. Мы ўсе жывём у эпоху прафесіяналізму. Некаторыя ўдзельнікі ІІ Нацыянальнага конкурсу прафесійнага майстэрства WorldSkills Belarus-2016 атрымалі цікавыя прапановы ад працадаўцаў яшчэ падчас конкурсу. «Гэта добры знак — значыць, у сучасным свеце іх прафесіі запатрабаваныя, а нашы майстры і педагогі выдатна падрыхтавалі сваю змену», — адзначыў Міхаіл Жураўкоў.

У апошнія гады стандарты прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі істотна змяніліся. Патрабаванні да рабочых спецыяльнасцяў сур'ёзна адрозніваюцца ад тых, што былі, скажам, 10 гадоў таму. Сучасны рабочы — гэта эрудзіраваны, высокакваліфікаваны спецыяліст, які, акрамя прафесійных ведаў, павінен валодаць спецыфічнымі навыкамі ў сумежных галінах, у тым ліку разбірацца ў інфармацыйных тэхналогіях, робататэхніцы і г.д. Такіх спецыялістаў толькі з вялікай нацяжкай можна назваць рабочымі ў звыклым разуменні гэтага слова, бо, па сутнасці, гэта інжынеры.

— Трэба ўжо адыходзіць ад паняццяў «рабочы», «тэхнік», «інжынер». У свеце няма такога дзялення: там ёсць спецыялісты з нізкай кваліфікацыяй, сярэдняй ці высокай, — падкрэсліў **рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Аркадзь ШКЛЯР.** — А ўжо якой установе яны атрымалі гэту кваліфікацыю — справа другасная. Сучасныя тэхналогіі патрабуюць спецыялістаў з высокімі прафесійнымі якасцямі, і менавіта гэта павінна быць прэстыжным.

У многіх краінах свету сёння вядуцца размовы пра перагляд падыходаў да рабочых спецыяльнасцяў і кваліфікацый. Некаторыя рабочыя спецыяльнасці або ўжо зніклі, або блізкія да знікнення. Замест іх з'яўляюцца іншыя, з прынцыпова новым узроўнем падрыхтоўкі. Цяпер, каб выконваць на вытворчасці спецыяльныя функцыі, рабочаму недастаткова валодаць толькі пэўнымі навыкамі — трэба мець шырокі дыяпазон ведаў у сумежных галінах.

Межы паміж узроўнямі адукацыі размываюцца. Ёсць прафесіі, дзе рабочаму хапае прафесійна-тэхнічнай адукацыі, але ёсць прафесіі, і іх становіцца ўсё больш, дзе ад рабочага персаналу патрабуецца наяўнасць сярэдняй спецыяльнай і нават вышэйшай адукацыі. Невыпадкова ў




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

многіх кампетэнцыях на чэмпіянаце прафесійнага майстэрства выступалі студэнты ВНУ і навучэнцы каледжаў.

> **«Галоўнае — стаць прафесіяналам і цалкам сябе рэалізаваць, а зусім не пагоня за дыпломам. Мы ўсе жывём у эпоху прафесіяналізму».**

Скажам, сёння токар, які працуе на сучасным станку з лічбавым праграмным кіраваннем, у адной асобе і тэхнолаг, і наладчык, і аператар, які кантралюе прыладу. А мехатронік — спецыяліст-дыягностык, які можа паглядзець і сказаць, у чым няспраўнасць механізма, і правесці дробны рамонт: ён ведае і механіку, і пнеўматыку, і электроніку. Ва ўсім гэтым маглі пераканацца госці чэмпіянату...

— Мы імкнёмся зрабіць рабочага больш адаптаваным да сучасных тэхналогій (а значыць — больш канкурэнтаздольным), фарміруючы сапраўдную рабочую арыстакратыю, — падкрэслівае Аляксандр Шкляр. — Для ўдзельнікаў такіх конкурсаў гэта цудоўная магчымасць прэзентаваць свае навыкі і майстэрства ў міжнародным фармаце. Відавочна, што падрыхтоўка каманды для ўдзелу ў такіх спаборніцтвах — справа не менш сур'ёзная, чым падрыхтоўка алімпійцаў. Нашых слаўтых спартсменаў усе ведаюць паіменна, і мы даб'ёмся, каб і маладыя людзі, якія перамагаюць у падобных прафесійных спаборніцтвах, былі ва ўсіх на слыху....

Сайман Бартлі, які ўжо не першы раз наведвае Беларусь, звярнуў увагу на пазітыўныя змены, што адбываюцца ў краіне, і выказаў намер выкарыстоўваць беларускі вопыт для папулярызацыі рабочых прафесій.

***Больш фота з чэмпіянату на сайце www.zviazda.by***

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Руплівым гаспадарам

# ЗАМАХНЁМСЯ НА БАКЛАЖАНЫ,

## або Ураджай залежыць ад... расады

**Ці магчыма вырасціць смачную агародніну на сваім участку? Як выбраць расаду і абараніць яе ад шкоднікаў? Сёння разам з айчыннымі спецыялістамі будзем шукаць адказы на гэтыя пытанні.**

Усё лета прапорхацца з парнікамі і застацца без добрага ўраджаю — гэта не для нас! Мы паспрабуем вырашыць праблему «вечназялёнага памідора» і нават замахнёмся на вырошчванне баклажанаў. І гэта можа атрымацца, калі набудзем добрую расаду. Не спакушайцеся на кволыя, недарослыя расліны, якімі могуць гандляваць на «стыхійных» кірмашах. Пакуль такая расада будзе «даганяцца», вы страціце каштоўны час, і ўраджай сапраўды не выспее.

### НЕ САДЗІЦЕ ШМАТ НОВЫХ САРТОЎ

У апошнія гады якасць «прыватнай» расады ўпала.

— Гэта звязана з тым, што людзі паставілі шклопакеты. Адпаведна раслінам, што выстаўлены на падаконніках, дастаецца менш святла. Пазней ім складаней прыстасавацца пры перасадцы, — заўважае **загадчык лабараторыі паслёнавых культур Інстытута агародніцтва НАН Беларусі, кандыдат біялагічных навук Леанід МІШЫН. —** Вядома, калі расаду загартаваць, ёй прасцей будзе перажыць перасяленне ў парнікі. Акрамя таго, можна выкарыстаць біялагічны прэпарат «Эпін» (выцяжка з рапсу), які павялічвае ўстойлівасць раслін да стрэсавых фактараў. Калі ім апрацуеце расаду перад высадкай у цяпліцу, ёй не страшныя будуць і холад, і сонечныя перапады. Я не раіў бы агароднікам адразу садзіць многа новых сартоў: чым іх больш, тым вышэйшая рызыка занесці захворванне. Напрыклад, толькі на тамаце ў свеце налічваецца больш за 200 вірусаў, і ад многіх інфекцый складана пазбавіцца нават пры дапамозе нейкіх прэпаратаў.

Часта агароднікі з расадай заносяць на свае ўчасткі кілу капусты. Калі які няволытны фермер пасадзіць хоць адзін з сартоў, на насенні якога была гэтая хвароба, яго ўчастак будзе заражаны, але расаду ён дазволіць вырасціць. І штогод такі гаспадар можа выстаўляць сваю прадукцыю на кірмашы і заражаць усе агароды. Таму расаду лепш набываць у буйных раслінаводчых гаспадарках, якія клапоцяцца пра сваю рэпутацыю, маюць добрых спецыялістаў і, безумоўна, робяць пратручванне насення. Пры высадцы расады капусты трэба абавязкова мачаць яе ў баўтушку з сумесі гліны і любога інсектыцыду. Бо ў той час, калі мы яе перамяшчаем у грунт, пачынаецца лёт крыжакветнай мухі, якая адкладвае яйкі ў глебу каля сцябла. Цяпер мух стала больш, бо рэзка пашырыліся пасадкі рапсу. Можна таксама праз тры дні пасля высадкі расады пад сцябло паліць яе прэпаратам ад насякомых. Не зробіце гэтага — не здзіўляйцеся, калі праз дзесяць дзён ніжнія лісты вашых раслін рэзка пажаўцеюць, засохнуць.

Сёння некаторыя гаспадары спрабуюць садзіць кавуны і дыні. Але неспрактыкаваным агароднікам складана будзе вырасціць ураджай. Без якаснай 30-40-дзённай расады тут не абысціся. У хатніх умовах яе вырасціць не так проста. Так, калі «кватэрная» расада памідораў выцягнулася, у парніку яна яшчэ можа набраць моц, а з расадай кавуноў такі фокус не пройдзе. У халаднаватае надвор'е расліны будуць кволымі, яны пачнуць хварэць, напрыклад, на каранёвыя гнілі.

### САКРЭТЫ СМАКУ

Сёння ўсё больш гаспадароў спрабуюць вырошчваць баклажаны. Ім варта звярнуць увагу на айчынныя сарты, бо замежныя ў нашых умовах не паспяваюць выспець. Для баклажанаў важна вырасціць якасную расаду, і расліну трэба фарміраваць у тры сцяблы, інакш яна будзе імкнуцца «захапіць» як мага больш прасторы. Калі расліну абмежаваць, яна «зразумее», што трэба размнажацца іншым спосабам — праз утварэнне пладоў. **Беларускія вучоныя вынайшлі новы напрамак, якога раней не было ў замежных вытворцаў. Яны вывелі сорт баклажана «Кулон», які мае гронкавы спосаб цвіцення, калі ў пазусе знаходзіцца не адна кветка, а 2-3.** Баклажан — культура даволі капрызная: спякота ў цяпліцы, мікраэлементаў не хапіла — кветкі апалі. А на «Кулоне» яны зацвітаюць паслядоўна, а значыць, больш шанцаў атрымаць ураджай.

***— Ці можа залежаць ад выбару насення, наколькі смачныя вырастуць плады? Многія дачнікі скардзяцца, што вырошчваюць, напрыклад, розныя сарты таматаў. Але нават спелыя памідоры ў іх несалодкія.***

— Безумоўна, смак звязаны з падборам сартоў. У першую чаргу трэба звярнуць увагу на найбольш устойлівыя, бо са слабых, хворых раслін смачных пладоў не сабраць. Несвоечасова праветрываецца цяпліца — будуць страчвацца смакавыя якасці.

Яшчэ адна прычына нясмачнай агародніны — нежаданне некаторых агароднікаў выкарыстоўваць комплексныя ўгнаенні. **Калі ў глебе няма фосфару, калію, шэрагу мікраэлементаў, вы ніколі не атрымаеце смачных памідораў, ды і іншай агародніны.** Некаторыя дачнікі сыплюць на грады попел — а гэта толькі калій. Добра, калі яшчэ ўнесены гной. Але арганіка змяшчае мала пажыўных рэчываў. Яе лепш за ўсё ўносіць пад тыя культуры, якія не патрабуюць працяглага захоўвання, пад зяленіва. Пад усё, што выспявае, лепш выкарыстоўваць комплекснае мінеральнае ўгнаенне: азот, фосфар, калій. І яшчэ на арганіцы культуры, якія выспяваюць, вельмі моцна пачынаюць пашкоджвацца рознымі грыбковымі захворваннямі. Напрыклад, унясенне вялікай колькасці гною пад таматы прыводзіць да ранняй фітафторы.



Якасная расада перца.

### ГМА СУПРАЦЬ КАЛАРАДСКІХ ЖУКОЎ

***— Ці дазваляе выкарыстанне пазакаранёвай падкормкі вырошчваць экалагічна чыстую прадукцыю?***

— Пры вырошчванні экалагічнай прадукцыі не трэба баяцца ўгнаенняў, бо расліна сама возьме тое, што ёй патрэбна, астатняе застанецца ў глебе, — зазначае Леанід Мішын. — Замена грунтоў у цяпліцы (раз на 4-5 гадоў) патрэбна не толькі з-за інфекцый, але і з-за назапашвання непатрэбных рэчываў. Праблема нітратаў з'явілася надуманай. Іншая справа пры вырошчванні экалагічнай прадукцыі — абарона ад насякомых. Калі прэпараты забіваюць шкоднікаў, яны дзейнічаюць і на нас. Крыху меншыя па сваёй шкоднасці могуць быць гербіцыды і фунгіцыды — прэпараты супраць пустазелля і хвароб. Беларуская агародніна і садавіна менш апрацаваная, чым тая, што завозіцца.

***— Ці магчыма вырошчваць прадукцыю, устойлівую да шкоднікаў?***

— Такіх сартоў у свеце няма, магчыма, яны будуць створаны з дапамогай ГМА. Напрыклад, адзін з варыянтаў развіцця бульбаводства — вывесці сарты, устойлівыя да каларадскага жука, каб не выкарыстоўваць хімію на барацьбу з ім. Вучоныя ўжывілі ў клетку бульбы рэчывы, якія ствараюць крышталі вапны. Каларадскі жук, калі паесць такой бульбы, не будзе развівацца. Дарэчы, на сёння не маецца дакладных навуковых ведаў аб шкодзе генна-мадыфікаваных прадуктаў. Вядзецца магутная інфармацыйная атака супраць іх, мабыць, для таго, каб не ва ўсіх краінах развіваўся такі кірунак. Пасля зацікаўленыя краіны запатэнтуюць свае вынаходкі і змогуць на іх продажы атрымліваць грошы. Магчыма, выкарыстанне ГМА — нядрэнная альтэрнатыва хімічным апрацоўкам.

**ВАЖНА. Якасная расада таматаў і перцаў павінна быць у стадыі бутанізацыі са сцяблом 5-6 міліметраў таўшчынёй, 25-27 см вышынёй!**

**Небяспечна нешта вырошчваць на кухні. Калі гаспадыня абабрала бульбу, а пасля пайшла паліваць расаду, яна таксама можа занесці інфекцыю.**

Для вырошчвання экалагічна чыстай прадукцыі трэба развіваць і такі напрамак, як біятэхналогіі. У нашай краіне яны выкарыстоўваюцца. Дапусцім, ад кляшча вельмі эфектыўны фітаселіус, ад белакрылкі — інкарзія. Калі на шкоднікаў выпусціць іх «ворагаў», хімічная абарона не спатрэбіцца.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ** ■

# НЕ ЎМЕЮЦЬ? ЦІ НЕ ХОЧУЦЬ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Звязда» ўжо пісала пра тое, што Аршанская спецаўтабаза на 12,2 мільярда рублёў завысіла аб'ёмы аказаных паслуг па зборы і вывазе адходаў і незаконна атрымала 6 мільярдаў з бюджэту. У дачыненні да трох кіраўнікоў прадпрыемства заведзены крымінальныя справы.

Высветлілася таксама, што спецыялізаваных аўто на прадпрыемстве больш, чым трэба.

— Памяншэнне колькасці машын з улікам рэальнага аб'ёму адходаў, іх эфектыўнае выкарыстанне дазволіць на трэць скараціць выдаткі на паліва і на 20% — на аплату працы. Агульнае зніжэнне выдаткаў складзе 18%, — паведамілі ў Камітэце дзяржаўнага кантролю.

Парушэнні парадку вызначэння нарматываў утварэння адходаў знойдзены і ў арганізацыях ЖКГ Дубровенскага і Талачынскага раёнаў.

### Не могуць «заставіць»?

На нядаўняй калегіі ў Камітэце дзяржкантролю дырэктар Аршанскай спецаўтабазы Алег Хлопчанка заявіў, што ў маленькіх вёсках адходы ў дастатковай колькасці не збіраюць таму, што немагчыма прымусіць людзей аплачваць вываз смецця.

— Але плата за вываз смецця абавязковая, як і плата за ваду, электраэнергію, газ, — выкрыў узровень кампетэнцыі дырэктара Аршанскай спецаўтабазы **Юрый ДЗЯДЗЁЛА, начальнік упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Віцебскага аблвыканкама.**

Намеснік старшыні Аршанскага райвыканкама, у сваю чаргу, паведаміў, што ў Оршы збіраюць асобна адходы з пластыку, паперы і шкла, але не паўсюль ёсць магчымасць паставіць кантэйнеры. Таму, напрыклад, у новых мікрараёнах праца вядзецца, а ў іншых дварах ёмістасці ёсць не ўсюды. У глыбінцы гэта наогул рэдкасць. Аднак праверка паказала: са 187 кантэйнераў у Аршанскім раёне трэць не былі ўсталяваныя.

Дарэчы, спецаўтабазе прапанавала супрацоўніцтва камерцыйная структура. Прыватнікі гатовыя збіраць пластыкавыя бутэлькі. Чаму б не скарыстацца такой магчымасцю? Правялі сход з удзелам зацікаўленых бакоў, але пытанне «Чаму прыватнікі не хочуць збіраць кардон і паперу?» засталося адкрытым. Адказ просты: апошнеe перапрацоўваць не так выгадна. У кантрольным ведамстве даручылі яшчэ раз абгрунтавана высветліць усе «за» і «супраць».

— Загадалі вывучыць дакладнасць фарміравання нарматываў утварэння камунальных адходаў. Неабходна прыняць меры па забеспячэнні належнага ўліку аб'ёмаў паслуг па зборы і вывазу смецця. Выкананне пастановы калегіі ўзялі на кантроль, — рэзюмавала работу калегіі **намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці Юлія АЎХУКОВА.**

### Куды здаць халадзільнік?

Паводле інфармацыі Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, штогод у рэгіёне ўтвараецца больш за 300 тысяч тон камунальных адходаў. Сярод іх ёсць каштоўныя: макулатура, шклабой, палімеры, тэкстыль і іншыя.

На сённяшні дзень доля здабывання другасных матэрыяльных рэсурсаў з камунальных адходаў — каля 15%. Для параўнання: у краінах Заходняй Еўропы — 30-50%.

Для вырашэння праблемы арганізавана праца прыёмных пунктаў па зборы і нарыхтоўцы цвёрдых бытавых адходаў ад насельніцтва, у тым ліку перасоўных, куды можна здаць халадзільнік і іншую дамашнюю тэхніку, якая адслужыла сваё.

— Полацкім УП «БелВТІ-рэгіён» арганізавана маштабная кампанія па раздзельным зборы небяспечных адходаў ад насельніцтва (энергазберагальныя лямпы і адпрацаваныя батарэйкі). Аказваюцца і паслугі па зборы і вывазе складанай бытавой тэхнікі (халадзільнікаў, тэлевізараў, пральных машын, прасаў і інш.). Толькі летась прадпрыемствам у гандлёвых аб'ектах вобласці ўстаноўлена 155 кантэйнераў для збору батарэек, 28 кантэйнераў для складанай бытавой тэхнікі і 30 кантэйнераў для энергазберагальных лямпаў, — паведамілі ў прыродаахоўным ведамстве.



Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

Кампаніяй «ДВЧ-Менеджмент» у вобласці рэалізуецца сістэма збору і выкарыстання адпрацаваных сінтэтычных і мінеральных аліў. У тым ліку і ад уласнікаў транспартных сродкаў. Ёмістасці для збору ад насельніцтва ўстаноўлены на базе Віцебскай і Полацкай гарадской нарыхтоўчай канторы (вул. Сушкова, 38).

Інфармацыю аб пунктах прыёму другаснай сыравіны ад насельніцтва па Віцебскай вобласці можна знайсці на сайце аператара другасных матэрыяльных рэсурсаў http://www.vtoroperator.by і на сайце «Зялёнай карты Беларусі» http://www.greenmap.by (г. Віцебск і г. Полацк).

— Устаноўка спецыяльных кантэйнераў для збору «карыснага смецця», арганізацыя пунктаў па прыёме другаснай сыравіны, развіццё сістэмы асобнага збору адходаў дазволяць павялічыць узровень здабывання другасных рэсурсаў. Іх выкарыстанне дазволіць сэканоміць прыродныя рэсурсы. Адпаведна, гэта паменшыць аб'ёмы паступлення адходаў на палігоны. У выніку знізіцца шкодная нагрузка на навакольнае асяроддзе, — дадалі дзяржаўныя экалагі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

ЗВЯЗДА
Наперад у мінулае
3 Беларусь
Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# У ПАРШЫНА, БЛІЖЭЙ ДА ЗОР

## Жанчыны, якія ведаюць сотні песень, і хустка як пазнака сацыяльнага статусу

**Разам са здымачнай групай праграмы «Наперад у мінулае» тэлеканала «Беларусь 3» сёння мы рушым у новую вандроўку-паляванне за песнямі і традыцыямі беларусаў. Гэтым разам кіруемся ў вёскі Паршына і Горы Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. Тут нас чакае знаёмства з творчасцю сапраўды вядомага фальклорнага гурта «Паршынскія зоры», а таксама сустрэча з супрацоўнікамі Горскага сельскага цэнтра фальклору і народнай творчасці, якія раскрываюць таямніцы, зашыфраваныя ў мясцовых строях. Дарэчы, у эфір канала «Беларусь 3» гэты выпуск праграмы «Наперад у мінулае» выйдзе ўжо ў нядзелю, 22 мая. Але давайце зазірнём у яе закуліссе.**



«Паршынскія зоры» на фестывалі «Берагіня» ў пасёлку Акцябрскі.

## І ПАСМЯЯЦЦА, І ПАСУМАВАЦЬ

Жыццё жыхароў вёскі Паршына, што сёння ўваходзіць у Горацкі раён, нельга назваць аднолькава добрым ці кепскім цягам усёй гісторыі яе існавання. Вёска, вядомая з XVI стагоддзя як уласнасць шляхты, праз некалькі стагоддзяў перайшла ва ўладу дзяржавы, а потым стала часткай памешчыцкай уласнасці. Таму мясцовыя жыхары мудра кажуць, што на памяці іх продкаў былі розныя падзеі, вясёлыя і сумныя. Натуральна, яны знайшлі сваё адлюстраванне ў песнях.

Сёння справай аднаўлення, захавання і перадачы наступнаму пакаленню песеннай і танцавальнай спадчыны рэгіёна займаецца народны ансамбль «Паршынскія зоры». Іх назва як мага лепш адпавядае сутнасці гурта, бо яны — сапраўдныя зоркі фальклорнай творчасці. Не так даўно калектыў адсвяткаваў 30-годдзе. За гады актыўнай дзейнасці спявачкі выступілі ў многіх гарадах Беларусі і Расіі: у Санкт-Пецярбургу ў кансерваторыі імя Рымскага-Корсакава, у Мінску нават на сцэне Палаца Рэспублікі, некалькі разоў прадстаўлялі Горацкі раён на Рэспубліканскім фестывалі фальклору «Берагіня», што праходзіць раз на два гады ў пасёлку Акцябрскі Гомельскай вобласці. А хрэсьбінныя і вясельныя песенныя цыклы калектыву ў 2012 годзе ўключаны ў спіс нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Дарэчы, мая сустрэча з гуртом не была першай. Два гады таму я пазнаёмілася з жанчынамі з «Паршынскіх зор» падчас фестывалю «Берагіня», але тады праз вірлівую праграму фестывалю і стомленасць саміх спявачак не атрымалася грунтоўна пагутарыць. А можа, гэта да лепшага, бо спатканне ў іх родным Паршыне, у доме Галіны Зубаравай, аздобленым вышыванымі ручнікамі, посцілкамі, атрымалася надзвычай цёплым і душэўным. Нават няглядзячы на мноства тэлекамер.

Калі ў жанчын з гурта запытацца, ці памятаюць яны нейкія абрадавыя, бытавыя, жартоўныя песні, якія спявалі яшчэ ў маладосці, адказ будзе нязменны:

— Усе!

Кожная з удзельніц калектыву ведае не менш як сотню песень, усе яны — з іх роднай мясцовасці, перанятыя ад мам і бабуль. І гэта — асаблівая рыса гурта. **Кіраўнік калектыву Любава УЛАДЫКА** кажа:

— «Паршынскія зоры» адметныя тым, што спяваюць жанчыны менавіта фальклорныя, свае родныя песні. Для іх гэта — скарбонка таленту, мудрасці. Ды і самі ўдзельніцы, якія на працягу трыццацігоддзя нясуць людзям прыгажосць і мудрасць народнай песні, — сапраўдны скарб. Нават жанчыны ў вельмі паважным узросце знаходзяць сілы, каб выходзіць на сцэну і спяваць, спяваць... Яны літаральна жывуць песняй. Напрыклад, найстарэйшай спявачцы калектыву Лідзіі Сіняковай ужо 87 гадоў, але яна з задавальненнем выступае і дорыць радасць гледачам. Гэта гонар для нас.

Дарэчы, Лідзія Пракопаўна прынесла ў гурт многа песень, некаторым ужо больш як сто гадоў, бо жанчына пераняла іх ад сваёй бабулі.

## СВЯТА — АЖ ШЭСЦЬ ДЗЁН!

Вясёлыя аўтэнтычныя песні — яшчэ адна адметная рыса гурта.

— Усіх здзіўляе, што мы спяваем вясёлыя бытавыя песні. Але гэта сапраўдныя творы, аднаўленыя ў нашай мясцовасці, — расказвае Любава Уладыка. — Кажуць, як жыў народ — такія і песні спяваў. У жанчын было цяжкае жыццё, і яны спявалі пра працу, нястачу ў побыце. Вясёлыя песні гучалі толькі ў тых выпадках, калі ў людзей было свята, на душы — светла, чыста. Мы аднавілі такія песні са слоў старэйшых удзельніц калектыву, яны вельмі рэдкія, а некаторыя нават атрымалі другое жыццё. Па ўспамінах, згадках нараджаліся асобныя словы, радкі, куплеты.

У ліку такіх песень можна назваць жартоўную «Праху»:

*А казалі на мяне, што не праха,*
*Ад торгу да торгу хадзіла,*
*Я й за рубль вераценца купіла,*
*За капейку кудзеліцу купіла.*
*Як устану ў панядзелак раненька,*
*Як выведу тры нітачкі я таненька.*
*Надзелала на руках мазалёчкі,*
*Застанецца мой міленькі без сарочкі...*

**10.00, 17.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**11.00, 7.10** Голыя і напалоханыя.
**12.00** У пагоні за класікай.
**13.00, 6.20** Глядзі ва ўсе вочы.
**15.00, 5.30** Браты Дызель.
**16.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Паляўнічыя на склады.
**19.00** Бітвы за кантэйнеры.
**20.00** Скарбы з каморкі.
**22.00** Залатая ліхаманка.
**0.00** Смяротная гутарка.
**1.00** Рачныя монстры.
**2.00, 4.40** Грошы ў засеках.
**3.50** Маланкавыя катастрофы.
**4.15** Сапраўдныя аферысты.

## Субота, 28 мая

### Беларусь 1

**6.50** Існасць.
**7.20 Меладрама «Парогі».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10 Серыял «Сваты-3».**
**10.15** «50 рэцэптаў першага».
**11.10** Дача.
**11.45** Нашы.
**12.10** «Здароўе». Ток-шоу.
**13.05** «Гумар на вайне». Дак. фільм.
**13.35 Меладрама «Шэсць сотак шчасця».**
**15.15** Краіна.
**16.20 Меладрама «Падзяліся шчасцем сваім». 1—4-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Фінал.
**0.15 Камедыя «Нявеста любой цаной».**
**1.55** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05, 21.05** Тэлебарометр.
**7.10 Серыял «Класная школа».**
**7.40 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**9.55** «Занадта шмат хвастоў».
**10.35** Азбука густу.
**11.10 Серыял «Хто ў доме гаспадар?»**
**13.10** Вяселле без баяна.
**13.45** «Бітва экстрасэнсаў. Апакаліпсіс».
**15.55** Капейка ў капейку.
**16.35** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**17.45 Камедыя «Знаёмства з бацькамі».**
**19.45** «Здзіві мяне». Талент-шоу.
**21.10 Фантастыка «Дывергент 2: інсургент».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.20** «Lady Блог». Модны праект.
**23.55 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**0.40** Хачу ў тэлевізар!

### Беларусь 3

**7.45, 11.00, 16.00, 21.00** «Калейдаскоп».
**8.00, 14.50 «Вячэрні лабірынт». Камедыя.**
**9.15** «Вялікай Перамогі салдаты». Дак. фільм.
**9.40 «Жалезнае поле». Драма.**
**11.15** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.50** «Час кіно».
**12.00 «Султан Бейбарс». Драма.**
**14.20** «Камертон». Пісьменніца Наталля Ігнаценка.
**16.15** «Апаленыя ўладай». Пахмурны прэм'ер з дзіцячымі вачыма. Дак. фільм.
**17.10 «Ціхі цэнтр». Меладрама. 1—4-я серыі.**
**20.40** «Калыханка».
**21.15** «Наступны прыпынак... Месяц». Навукова-папулярны фільм.
**21.55** AC/DC. Канцэрт групы ў Донінгтане.
**23.40** «Бард-парад».

### Беларусь 5

**7.50, 22.35** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**8.30** Піт-стоп.
**9.00** Фактар сілы.
**9.30** Футбол. Таварыскі матч. Паўночная Ірландыя — Беларусь.
**11.15, 22.45** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**13.05** Хакей. Чэмпіянат свету.
**15.00** Авертайм.
**15.30** Мастацкая гімнастыка. Шоу зорак.
**17.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**17.30** Адзін крок на шляху да Алімпу. Веславанне на байдарках і каноэ. Відэачасопіс.
**18.00** Тэніс. Ралан Гарос.
**20.00** Змешаныя адзінаборствы. Адкрыты чэмпіянат Беларусі.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.00** «Ідэальны рамонт».
**12.00** «Разумніцы і разумнікі».
**12.45** «Адкрыццё Кітая».
**13.15** «Вольга Шукшына. «Калі б тата быў жывы...»
**14.15 Камедыя «Не можа быць!»**



**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.20** «Удача ў прыдачу! З «Еўраопт».
**18.00** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**19.00 Драма «Інсайт».**
**21.05** «Сёння вечарам».
**22.35 Меладрама «Захапленне Стэлы».**

### СТБ

**6.15 «Студэнты». Серыял.**
**7.55 Маст. фільм «Прачнуўшыся ў Рына».**
**9.30** «Часткі свету».
**10.05** «Ежа багоў».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35 «Салдаты 11». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40. 1.25 Маст. фільм «Я служу на мяжы». СССР, 1973 г.**
**15.20** «Вадзіць па-руску».
**15.50** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.35 «Цень самурая». Серыял. Заключныя серыі.**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Бывай, дзетка, бывай».**
**22.10 «Смак забойства». Серыял.**

### МІР

**6.00 Маст. фільм «Ёлкі-палкі».**
**7.30** «Саюзнікі».
**8.00, 3.15** М/ф.
**8.30** «Медыцынская праўда».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45, 23.15 Маст. фільм «Формула кахання».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00 Маст. фільм «Уз'яднанне сямейкі Адамс».**
**14.45 Маст. фільм «Тайна жалезных дзвярэй».**
**16.15 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
**21.05** «Трымайся, шоубіз!»
**21.30 Маст. фільм «На кручку».**
**0.55** «Дыяспары».
**1.25 Маст. фільм «Волга-Волга».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Няхай гавораць».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Правілы руху».
**12.10 Маст. фільм «Час збіраць».**
**14.15** «Асабістае. Аляксей Чумакоў».
**15.00** «Ха». Маленькія камедыі.
**15.35 Маст. фільм «Насуперак усяму».**
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**21.00 Маст. фільм «Серабрысты звон ручая».**
**22.40 Маст. фільм «Даўгі сумлення».**

### НТБ—Беларусь

**5.50** «Астрапрагноз».
**5.55, 8.20 Серыял «Сужэнцы».**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.50** Кулінарны паядынак.
**9.25** «Урачэбныя тайны плюс».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.00** «Кватэрнае пытанне».
**13.10** «Высоцкая Life».
**14.10** «Люстэрка для героя».
**15.05 Серыял «Іржа».**
**16.20 Серыял «Законы вуліц».**
**18.10** «Следства вялі...»
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.50** «Ты не паверыш!»
**21.40** «Салтыкоў-Шчадрын шоу».
**22.30** «Званок». Пранк-шоу.
**23.00 Серыял «Дазнаўца».**

### 8 канал

**9.00, 15.50, 19.00, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.15 Серыял «Забі і вылечы».**
**10.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**10.50, 15.55, 18.50, 21.00** «Хатняя крама».
**10.55 Трылер «Каардынаты «Скайфал».**
**13.15 Трылер «Цёмны рыцар».**
**15.35** «Мультпарад».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**17.30 Драма «Гаспадар тайгі».**
**19.05 Трылер «Сціральнік».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Трылер «Адраджэнне легенды».**

### ВТБ

**6.00, 9.30, 5.30** «Лаві момант».
**6.30** «Паспецъ за 24 гадзіны».
**7.30** М/ф «Ёка».
**7.45** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00** М/ф «Машыны казкі».
**8.30, 17.00** «Ералаш».
**9.00, 4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**10.00, 01.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Хто каго на кухні».
**12.30** «Здаецца! З рамонтам».
**13.30** Трылер «Гульня на выжыванне».
**15.30** «Уральскія пельмені».
**17.00** Фэнтэзі «Павуцінне Шарлоты».
**19.00** «Два галасы».
**20.30** Фантастыка «Час расплаты».
**23.00, 4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**23.30** «Дзікія гульні».
**0.30** Скетчкам «Студэнты».
**3.30** «Дурні і дарогі».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.30, 17.30, 23.40** Карамзін — 250.
**10.35** «Выпадковыя пасажыры». Маст. фільм.
**11.55** Пернікавы домік. «Колькі вяровачцы ні віцца...»
**12.25** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**12.50** Дзяржаўны акадэмічны ансамбль народнага танца імя Ігара Маісеева. М. Мусаргскі «Ноч на Лысай гары».
**13.35** «На краі зямлі расійскай». Дак. фільм.
**14.45** «Белы снег Расіі». Маст. фільм.
**16.15** «Тайна архіва Хадасевіча. Аповед Соні Багатыровай». Дак. фільм.
**17.00** Навіны культуры.
**17.35, 1.15** «Табу. Апошні шаман». Дак. фільм.
**18.00** Да 75-годдзя з дня нараджэння Алега Даля. «У чацвер і больш ніколі». Маст. фільм.
**19.30** «Больш чым каханне». Алег і Ліза Даль.
**20.10** «Рамантыка раманса». Шлягеры 60-х.
**21.10** Кіно на ўсе часы. «Сціплае абаянне буржуазіі». Маст. фільм.
**23.00** «Белая студыя».
**23.45** «Чарговы рэйс». Маст. фільм.
**1.45** «Шызы галубочак». М/ф.
**1.55** «Шукальнікі». «Каўказская амазонкі».
**2.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «Яловая субмарына». Наталля Вятліцкая. 2005 год.
**6.35, 8.15, 8.45, 9.40, 11.00, 12.55, 14.45, 15.40, 17.00, 19.15, 20.10, 23.00, 0.55, 2.45, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**6.55** Маст. фільм «Жанчыны жартуюць усур'ёз».
**8.30** Дак. фільм «Мода 91–92».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1957. 3-я частка.
**12.45** Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён».
**13.15** Маст. фільм «Я вас кахаў...».
**16.00** «Колба часу».
**18.00** «Зямля—Паветра». Гурт «Жукі». 2003 год.
**19.40** Дак. фільм «Фуршэт, фуршэт...».
**20.25** Дак. фільм «Аляксандр Разенбаум. Твар у твар».
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Ішоў сабака па раялі».
**0.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Алег Анофрыеў. 2008 год.
**1.15** Маст. фільм «Калі ёсць ветразі».
**2.30** Дак. фільм «Мода 89— 90».
**5.10** «Я сама». Тэма: «Я такая непрыгожая». 1995 год.

### EuroSport 1

**4.00, 7.00, 11.45, 18.45** Тэніс. «Ралан Гарос».
**6.00, 23.00** Веласпорт. Джыра. Агляд падзей.
**9.30, 15.30, 2.30** Веласпорт. Джыра д'Італія.
**10.15, 22.00** Тэніс. «Ралан Гарос». Матч дня.
**11.15, 21.30, 2.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс».
**15.15, 18.30** Веласпорт. Джыра экстра.
**0.00** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**0.45** Конны спорт. Тур Global champions.

### Камедыя

**0.30** «Сёння ноччу я сплю з табой». Меладрама.
**2.00** «Выхадныя». Прыгоды.
**3.35** «Кахаю тваю жонку». Камедыя.



**5.20** «Праект «А». Камедыя.
**7.00** «Праект «А»: частка другая». Камедыя.
**8.50** «Вясёлыя і загарэлыя». Камедыя.
**10.35** «Халасцякі ў адрыве». Камедыя.
**12.15** «Махляры». Камедыя.
**14.10** «Паўднёвыя моры». Камедыя.
**16.00** «Спатканне». Камедыя.
**17.35** «Палавое выхаванне». Камедыя.
**19.15** «Забойны футбол». Камедыя.
**21.15** «Бясстрашная гіена 2». Баявік.
**22.55** «Сэрца воіна». Прыгоды.

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.45** «Сардэчна запрашаем дадому!»
**10.35** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.25** «Доказ віны».
**12.15, 2.10** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**15.35** «Крама цудаў». Фэнтэзі.
**17.15** «10 самых».
**17.50, 5.10** «Гучная справа».
**18.55** «Бой з ценем 3». Баявік.
**21.20** «У майго дзіцяці шостае пачуццё».
**22.15** «Каардынаты «Скайфал». Баявік.
**0.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.10, 14.10** Фантастыка «Спадар Ніхто».
**8.30, 2.10** Меладрама «Цяжкасці перакладу».
**10.20** Прыгоды «Чарлі і шакаладная фабрыка».
**12.20** Камедыя «Сцюарт Літл».
**16.35** Прыгоды «Джуманджы».
**18.25** Фантастыка «Прыстанак зла 4: жыццё пасля смерці».
**20.10** Фантастыка «Ева: штучны розум».
**22.10** Драма «Язмін».
**0.10** Трылер «Самы небяспечны чалавек».
**4.00** Драма «Перапыненае жыццё».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.20** Драма «Духless 2».
**8.20, 2.20** Драма «Мусульманін».
**10.20, 4.25** Трагікамедыя «Чалавек ля акна».
**12.20** Меладрама «Вернасць».
**14.20** Камедыя «Змешаныя пачуцці».
**16.20** Драма «Чыстая перамога».
**20.20** Меладрама «КосцяНіка. Час лета».
**22.20** Драма «Нябесны суд. Працяг».
**0.20** Драма «Weekend».

### National Geographic

**6.00, 13.35** Гульні розуму.
**6.50** Зрабі або памры.
**7.15, 13.10, 0.30, 3.40, 5.40** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40** Навука будучыні.
**8.30** Спецвыпуск Nat Geo. Глабальнае пацяпленне.
**9.20** Золата Юкана.
**10.05** Незвычайныя промыслы.
**10.50, 17.50** Каралі шахт.
**11.40, 19.25** Сапраўдны суперкар.
**12.25** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**14.00** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**14.45** Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
**15.35** Экстрэмальныя даследчыкі.
**16.20** Даследчык 2.0.
**17.10** Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога.
**21.00, 0.50, 4.00** Лініі Наска.
**21.45, 1.40, 4.50** Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
**22.30, 2.30** Зона 51.
**23.20** Расследаванні авіякатастроф.
**0.05, 3.15** Зрабі або памры.

### Discovery

**8.00** Смяротная гутарка.
**9.00** Выжыць разам.
**10.00** Рачныя монстры.
**11.00, 4.40** Паляўнічыя на склады.
**12.00** Скарбы з каморкі.
**13.00** Бітвы за кантэйнеры.
**14.00** Хуткія і гучныя.
**15.00, 2.55, 6.20** Поўны фарсаж.
**16.00, 5.30** Прыроджаны механік.
**17.00** Буйны ўлоў.
**22.00** Голыя і напалоханыя.
**23.00, 7.10** Футбол 360.
**0.00** Паездка ўлегцы.
**1.00** Аляска: апошні рубеж.
**2.00** Выжыць разам.
**3.50** Хлопцы з Юкана.

# ШАШКІ

**Выпуск №13**

Сёння нашым чытачам прапануецца бліцконкурс з 6 пазіцый майстра спорту Беларусі па шашачнай кампазіцыі Дзмітрыя Камчыцкага (Магілёў).

Бліцконкурс будзе праведзены ў два туры па тры пазіцыі ў кожным. Пераможца атрымае прыз ад аўтара кампазіцый. Сёння прапануюцца апошнія тры заданні.

№5



№4
Белыя простыя: c7, e1, e3, e5, f4, f6, g3 (7).
Чорныя простыя: b2, b4, b8, c5, d6, h2 (6).

№5
Белыя простыя: b2, b4, b6, c3, g7, h2 (6).
Чорныя простыя: a7, d6, e3, e5, g5, h4 (6).

№6
Белыя простыя: a1, c3, d2, d4, e7 (5).
Чорныя простыя: a5, b2 , b6, c5, f4 (5).

Ва ўсіх становішчах белыя пачынаюць і выйграюць.

З 21 па 28 красавіка ў Санкт-Пецярбургу адбыўся маладзёжны чэмпіянат Еўропы па шашках-64.

Выдатна выступілі беларускія шашысты. Чэмпіёнамі Еўропы сталі Вера Хвашчынская, Віталь Новікаў, Міхаіл Семянюк, Аляксандр Ржэуцкі, Віктория Нікалаева і Дар'я Нікіфарава. «Серабро» на рахунку Фёдара Бакача, Аляксандры Спірынай і Яны Якубовіч, бронза ў Аляксея Куніцы, Марыі Міронавай і Марата Льва.

Нашы юныя «зорачкі» перамаглі ў агульным камандным заліку, а таксама асобна сярод юнакоў і дзяўчат!

Пішыце на адрас: Газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# SHUMA АДСВЯТКУЕ «АЛЬБОМ ГОДА» СОЛЬНЫМ КАНЦЭРТАМ

**27 мая этна-электронны гурт Shuma ў межах вялікага сольнага выступлення ў Мінску прэзэнтуе свой новы альбом «Сонца». Мерапрыемства адбудзецца пры падтрымцы інтэрнэт-аператара «АтлантТэлекам».**

Канцэрт можна лічыць своеасаблівым працягам узнагарод Experty.by, на якіх дэбютны дыск Shuma «Жніво» (2015) перамог у галоўнай намінацыі «Альбом года».

Выступленне Shuma адбудзецца ў прасторным сталічным ангары «Хуліган», які дазваляе рэалізаваць маштабныя творчыя задумкі калектыву, у тым ліку візуальнае праграмаванне і відэамэпінг. Сябро ўскую музычную падтрымку забяспечаць DJ Papa Bo Selektah і Shumaboy.

— Музычна новы альбом яшчэ больш электронны і груввы, таму і канцэрт будзе адбывацца ў выглядзе адзінага перформанса, у якім музыка шчыльна пераплятаецца з тэхналагічным візуальным складнікам, — распавяла Руся, вакалістка і ідэйны лідар Shuma.

Нагадаем, гурт Shuma быў заснаваны ў 2012 годзе і працуе ў стылістыцы digital archaica, спалучаючы беларускія народныя песні і сучаснае электронная гучанне. Склад гурта: Руся (вакал, канцэпцыя), Надзея Чугунова (вакал), Аляксей Будзько (бас, клавішныя). Саўндпразюсарамі з'яўляюцца Nick Cherny, Alexis Scorpio.

Сваіх прыхільнікаў гэтым разам гурт запрашае на музычнае спатканне 27 мая ў «Хуліган. Ангар».

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*

# НАСІ ВУСЫ!

## 5 савецкіх акцёраў, якія зрабілі свае вусы знакамітымі

**Як сцвярджаюць знаўцы гісторыі стылю, мода на раслінасць на мужчынскім твары — адна з самых пераменлівых. Мужчыны то бязлітасна галілі вусы, то насілі іх рамантычна-тонкімі ці, наадварот, падкрэслена густымі і пышнымі, завітымі, зухавата падкручанымі, напамаджанымі... Прапануем успомніць 5 вядомых акцёраў савецкага кіно, чые вусы сталі, можна сказаць, іх візітоўкай, «фірменным знакам». Апазнаеце іх па нашых падказках?**



**«Я акадэміяў не праходзіў... Я іх не закончыў».** У фільмаграфіі гэтага акцёра — больш як 40 работ у розных жанрах, але ў гісторыю кіно ён увайшоў як найлепшы выканаўца ролі легендарнага камдыва Чапаева. Менавіта за гэтую ролю ў фільме братоў Васільевых, знятым у 1934 годзе, ён атрымаў званне народнага артыста і ўсесаюзную любоў гледачоў. Праўда, у фільме вусы Чапаева накладныя — у жыцці акцёр іх амаль не насіў.

**«Мне надакучыў гэты апошні рускі, і перадапошні таксама!»** Вусы акцёра, спевака, футбольнага заўзятара, цёзкі апошняга савецкага генсека ўвайшлі не толькі ва ўсе кінафільмы з яго ўдзелам, але і ў сучасны фальклор — пра іх расказваюць анекдоты, спяваюць прыпеўкі, малююць карыкатуры. Паводле ўспамінаў самога акцёра, бязвусым ён хадзіў толькі да заканчэння інстытута і падчас службы ў арміі, дзе вымушаны быў пагаліцца. Але з першай жа ролі ў кіно (дэбют адбыўся ў 1973 годзе ў стужцы «Масты») артыст і вусы, і таксама стыльны капялюш, сталі адным цэлым.

**«Сто грам не стопкран: тарганеш — не спынішся».** Паводле апытання часопіса «Савецкі экран», у 1985 годзе сына вядомага дзіцячага паэта і пісьменніка гледачы назвалі лепшым акцёрам — за ролю ў фільме «Жорсткі раманс». Да таго часу ён ужо зняўся ў «Прыгодах Кроша», «Я крочу па Маскве» і яшчэ некалькіх фільмах, аднак менавіта са зменай іміджу прыкладна ў пачатку 70-х пачалося яго ўзыходжанне на Алімп у якасці акцёра, рэжысёра, сцэнарыста і прадзюсара.

**«Вы і толькі вы нагадваеце мне маю каханую, маю чарнявую, маю бездамоўную... гаўбіцу».** Сын селяніна, вучань электраманцёра, зорка драмгуртка, разведчык, студэнт МХАТ і, нарэшце, «кароль камедыі», народны артыст, які сыграў у кіно без адной сто роляў. У гэтага рыжавусага ўсмешлівага артыста аднолькава пераканаўча выходзіў кіношны цар і прараб на будоўлі, нягоднік-рэжысёр Якін і крыху звар'яцелы айцец Фёдар, — а галоўнае, што ў кожнай з гэтых роляў ён палюбіўся і запомніўся гледачам.

**«У мяне нага ў двух месцах зламана... Затое слых добры».** У дзяцінстве гэты спадчыннік казацкага роду хацеў стаць клоўнам, але ў выніку пасля тэатральнага вучылішча скончыў яшчэ і рэжысёрскі факультэт, зняўся больш як у 100 кінафільмах — і працягвае працаваць. Са сваіх роляў найбольш любіць музыканта ў фільме «Мы з джаза». Двайное прозвішча, дарэчы, ён стварыў сабе сам, дапісаўшы да сапраўднага прыстаўку — а чаму менавіта такую, лёгка здагадацца, прыгадаўшы шавялюру і пышныя чорныя вусы акцёра.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

**Носьбіты вусоў:** 1. Барыс Бабачкін. 2. Міхаіл Баярскі. 3. Мікіта Міхалкоў. 4. Міхаіл Пугаўкін. 5. Аляксандр Панкратаў-Чорны.

## Нядзеля, 29 мая

### Беларусь 1

**6.50 Меладрама «Парогі».**
8.30 Народная раніца.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
**9.40 Серыял «Сваты-3».**
10.50 «50 рэцэптаў першага».
11.45 Нашы.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Камедыя «М + Ж».**
14.20 Каробка перадач.
15.15 Твой горад.
15.30 Вакол планеты.
16.20 Зона Х. Вынікі тыдня.
**17.00 Меладрама «Незабудкі».**
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
22.10 Клуб рэдактараў.
**22.50 Меладрама «Шэсць сотак шчасця».**

### Беларусь 2

7.00, 21.10 Тэлебарометр.
**7.05 Серыял «Класная школа».**
**7.35 Серыял «Хто ў доме гаспадар?»**
9.35 «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвэл-шоу.
10.40 «Універ-шэф».
11.20 Ваша лато, Пяцёрачка.
11.50 Зразумець і абясшкодзіць.
**12.25 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**14.45 Камедыя «Знаёмства з бацькамі».**
**16.45 Фантастыка «Супер 8».**
**18.50 Фантастыка «Дывергент 2: інсургент».**
20.55 Хачу ў тэлевізар!
21.45 Кіпень.
22.05 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.10 Дэтэктыў «Падмані мяне 2».**
**23.05 Серыял «Косці».**

### Беларусь 3

8.00, 11.25, 17.00, 21.00 «Калейдаскоп».
**8.15, 19.30 «За цудоўных дам!» Камедыя.**



9.25 «Бард-парад».
10.05 «Наперад у мінулае».
10.30 Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
11.40 «Музеі Беларусі». Веткаўскі музей стараверства і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава.
12.10 «Святыні Беларусі». Касцёл Святой Троіцы ў аграгарадку Гярвяты.
12.35 «Апаленыя ўладай». Пахмурны прэм'ер з дзіцячымі вачыма. Дак. фільм.
**13.30 «Ціхі цэнтр». Меладрама. 1—4-я серыі.**
**17.15 «Чалавек з бульвара Капуцынаў». Камедыя.**
18.50 «Кіно і час». Віскулі.
20.40 «Калыханка».
21.15 «Аляксандр Малінін. Голас душы». Канцэрт.
**22.35 «Альбер Камю». Драма.**

### Беларусь 5

7.45, 22.15 PRO спорт. Навіны.
7.55 Хакей. Чэмпіянат свету.
9.50 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Фінал.
12.15, 22.25 Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
14.10 Тэніс. Ралан Гарос.
16.15 Хакей для ўсіх.
16.55 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. Фінал. Другі матч.

18.35 Адзін крок на шляху да Алімпу. Мастацкая гімнастыка. Відэачасопіс.
19.10 Мастацкая гімнастыка. Кубак свету. Сафія.
21.45 Авертайм.

### АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.45 «Фазэнда».
11.20 «Адгадай мелодыю».
11.55 «Я баюся, што мяне разлюбяць. Андрэй Міронаў».
12.55 «Госці па нядзелях».
13.55 «Раманавы».
16.15 Навіны спорту.
16.20 Юбілейны вечар Валерыя і Канстанціна Меладзэ.
18.00 «Без страхоўкі».
20.00 Контуры.
21.05 «Афтар жжот».
22.05 «Што? Дзе? Калі?» Летняя серыя гульняў.
**23.10 Маст. фільм «Каханне ў космасе».**

### СТБ

**6.00 «Студэнты». Серыял.**
7.40 «Скардзіцца дазваляецца».
8.05, 17.05 «Аўтапанарама».
8.30 «Самая карысная праграма».
**9.30 Маст. фільм «Прарыў».**
11.00 «Вялікае снеданне».
**11.40 «Салдаты 12». Серыял.**



13.30, 16.30 «24 гадзіны».
**13.40, 1.20 Меладрама «Зімовы вечар у Гаграх».**

15.25 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.50 «Наша справа».
17.35 «Ваенная тайна».
19.30 «Тыдзень».
**20.25 Маст. фільм «Доказ».**
22.10 «Ілжывая гісторыя». Дакументальны спецпраект.
23.50 «Соль». Музычнае шоу.

### МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.15 «Даведнік».
6.30 М/ф.
9.00 «Культпрасвет».
9.30, 3.50 «Чаму я?»
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
**10.15 Серыял «Восеньскія кветкі», 1-4 серыі.**



13.45 «Трымайся, шоубіз!»
**14.15 Маст. фільм «Казка. Ёсць».**
**16.15, 22.15 Серыял «Страсці па Чапаю».**
21.00 «Разам».
**23.15 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
**4.15 Маст. фільм «Маё каханне».**

### РТР—Беларусь

7.00 «Пакой смеху».
**7.45 Маст. фільм «Даўгі сумлення».**
11.00, 14.00 Весткі.
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.05 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
12.40 «Ранішняя пошта».
13.20 «ХА». Маленькія камедыі.
14.00 Весткі.

14.15 «Смяяцца дазваляецца».
**15.15, 22.30 Маст. фільм «Пададры мне нядзелю».**
20.00 Весткі тыдня.
21.30 Ток-шоу «Што адбываецца».
23.50 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
**6.00, 8.20 Серыял «Сужэнцы».**
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Ядзім дома».
10.25 «Першая перадача».
11.05 «Цуд тэхнікі».
12.00 «Дачны адказ».
13.05 «НашСпажыўНагляд». Не дай сябе падмануць!
14.15 «Паедзем, паядзім!»
**15.05 Серыял «Іржа».**
**16.20 Серыял «Законы вуліц».**
18.10 «Следства вялі...».
19.00 «Акцэнты тыдня».
19.45 «Пазнякоў».
**20.00 Маст. фільм «Ніадкуль з каханнем, або Вясёлае пахаванне».**
22.15 «Юля Абдулава. Мая споведзь».
**23.10 Серыял «Дазнаўца».**

### 8 канал

9.00, 15.55, 19.05, 23.25 «Надвор'е».
9.05, 16.00 «Мультпарад».
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30 «Мой любімы гадавальнік».
11.00, 15.45, 18.55, 21.00 «Хатняя крама».
**11.15 Серыял «Камісар Рэкс».**
**12.50 Драма «Хросная маці».**
**17.15 Серыял «Чыста англійскае забойства».**
**19.10 Трылер «Цунамі».**
20.50 «Вечарніца».
**21.05 Драма «Апакаліпсіс».**

### ВТБ

6.00, 23.05, 4.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
6.30 «Здаецца! З рамонтам».
7.30 М/ф «Ёка».
7.45 М/ф «Смяшарыкі».
8.00 М/ф «Машыны казкі».
8.30, 14.45 «Ералаш».
9.00 «Хто каго на кухні».
9.30, 3.30 «Лаві момант».
10.00, 1.00 «Турбаміксер».
12.00 «Паспець за 24 гадзіны».
13.00, 19.30 «Уральскія пельмені».
13.30 Фэнтэзі «Павуцінне Шарлоты».
15.30 «Два галасы».
17.00 Фантастыка «Час расплаты».
21.00 Трылер «Нястрымныя».
0.00 «Кіно ў дэталях».
4.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
5.30 «Дурні і дарогі».

### Культура

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
10.35 «Чарговы рэйс». Маст. фільм.
12.05, 16.20, 22.55 Карамзін — 250.
12.10 «Легенды сусветнага кіно». Дзін Рыд.
12.40 «Расія, любоў мая!» «Абазіны. Смак мёду і халвы».
13.10 «Хто там...».
13.40, 23.55 «Птушыны рай. Агёльскі нацыянальны парк». Дак. фільм.
14.40 «Што рабіць?»
15.25 «Шведская запалка». Маст. фільм.
16.25 «Пешшу...» Масква шакаладная.
16.55, 1.55 «Шукальнікі». «Тайна вязняў Кексгольмскай крэпасці».
17.45 Хрустальны баль «Хрустальнай Турандот». Бенефіс Аляксандра Шырвінта.
19.10 Красная плошча. Канцэрт, прысвечаны Дню славянскага пісьменства і культуры.
20.45 Кіно пра кіно. «Плюмбум. Металічны хлопчык». Дак. фільм.
21.25 «Плюмбум, або Небяспечная гульня». Маст. фільм.
23.00 «Блізкае кола Дзмітрыя Крымава».
0.55 Толькі класіка. Анці Сапрыла і яго «Swing Band».
1.40 «Перш мы былі птушкамі». М/ф для дарослых.
2.40 Сусветныя скарбы.

### Настальгія

6.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1957. 3-я частка.
6.45 Дак. фільм «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». 1960 год.
6.50, 8.40, 9.40, 11.00, 13.15, 14.10, 17.00, 18.45, 20.15, 21.40, 23.10, 0.35, 2.15, 2.45, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.
7.15 Маст. фільм «Я вас кахаў...»
9.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00 «Колба часу».
12.00 «Зямля—Паветра». Гурт «Жукі». 2003 год.
13.40 Дак. фільм «Фуршэт, фуршэт...».
14.25 Дак. фільм «Аляксандр Разенбаум. Твар у твар».
15.00 «Быў час». 2009 год.
16.00 Маст. фільм «Ішоў сабака па раялі».
18.00 «Акулы пяра». Алёна Апіна.
19.10 «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Міхаіл Жванецкі.
21.00 «Рок-н-рол ТБ». 1992 год.
22.00 Маст. фільм «У маёй смерці прашу вінаваціць Клаву К.».



0.00 «Яловая субмарына». Наталля Вятліцкая. 2005 год.
0.55 Маст. фільм «Жанчыны жартуюць усур'ёз».
2.30 Дак. фільм «Мода 91–92».
4.00 «Народжаны ў СССР».

### EuroSport 1

4.00, 7.00, 11.45, 18.45 Тэніс. «Ралан Гарос».
6.00, 1.00 Веласпорт. Джыра. Агляд падзей.
9.30, 15.30 Веласпорт. Джыра д'Італія.
10.15, 22.00 Тэніс. «Ралан Гарос». Матч дня.
11.15, 21.30, 2.00 Тэніс. «Гейм, сэт і Матс».
15.15, 18.30 Веласпорт. Джыра экстра.
23.00, 2.30 Футбол. Чэмпіянат MLS.

### Камедыя

0.30 «Мой самы страшны кашмар». Меладрама.
2.10 «Красуні». Меладрама.
3.50 «Камедыянты». Лепшае.
4.10 «Чужое вяселле». Меладрама.
5.45 «Патрабуюцца каркэтныя паводзіны». Камедыя.
7.25 «Кахаю цябе на ўсіх мовах свету». Камедыя.
9.10 «Каханне без перасадак». Меладрама.
10.50 «Выхадныя». Прыгоды.
12.25 «Нешта падобнае на шчасце». Камедыя.
14.10 «Шчаслівае сямейства». Камедыя.
15.35 «Камедыянты» (Шоу).
16.00 «Сёння ў меню». Камедыя.
17.45 «Prada і пачуцці». Меладрама.
19.35 «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі». Прыгоды.
21.30 «Па прыкметах сумяшчальнасці». Меладрама.
23.05 «Дзіўныя сваякі». Камедыя.

### ТБ3

6.00 М/ф.
9.40 «Паненка і кулінар».
10.10 «Далёка і яшчэ далей».
11.10, 1.10 «Сіндром Дракона». Серыял.
15.00 «Жонка. Гісторыя кахання».
16.20 «Дзеці Вадалея». Меладрама.
20.10 «Без падману».
21.05 «Мама міа!» Мюзікл.
23.00 «Асцярожна, махляры!»
23.35 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
4.40 «Зорнасць на карысць». Дак. фільм.

### ТБ1000

6.10, 16.10 Прыгоды «Чарлі і шакаладная фабрыка».
8.10, 4.25 Драма «Язмін».
10.10, 2.25 Фантастыка «Ева: штучны розум».
12.10 Трылер «Самы небяспечны чалавек».
14.15 Меладрама «Цяжкасці перакладу».
18.15 Камедыя «Сцюарт Літл».
20.10 Баявік «Інкасатар».
22.10 Драма «Я сыходжу — не плач».
0.15 Трылер «Выжывуць толькі палюбоўнікі».

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20, 18.30 Драма «Кандагар».
8.20, 2.20 Меладрама «Косця-Ніка. Час лета».
10.20, 22.20, 4.25 Драма «Нябесны суд. Працяг».
12.10 Камедыя «Па вуліцах камоду вадзілі...»
13.25 Казка «Чорная курыца, або Падземныя жыхары».
14.45 Драма «Мусульманін».
16.40 Трагікамедыя «Чалавек ля акна».
20.20 Меладрама «Анёл».

0.20 Баявік «Адваротны адлік».

### National Geographic

6.00, 13.30 Гульні розуму.
6.50 Зрабі або памры.
7.15, 13.10, 0.30, 3.35, 5.30 Навуковыя недарэчнасці.
7.40, 17.05 Навука будучыні.
8.30 Дзікае надвор'е.
9.20 Золата Юкана.
10.00 Незвычайныя промыслы.
10.50 Каралі шахт.
11.35 Сапраўдны суперкар.
12.20 Міжнародны аэрапорт Дубай.
13.55 Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
14.40 Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
15.30 Ліній Наска.
16.20 Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
20.15 Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога.
21.00, 0.50, 4.00 Пячора гігантскіх крышталёў.
21.45, 1.40, 4.45 Даследчык 2.0.
22.30, 2.25 Экстрэмальныя даследчыкі.
23.20 Расследаванні авіякатастроф.
0.05, 3.10 Зрабі або памры.

### Discovery

8.00, 15.00 Голыя і напалохання.
9.00, 1.00 Апошнія жыхары Аляскі.
10.00 Хлопцы з Юкана.
11.00, 4.40 Аляска: апошні рубеж.
12.00, 20.00 Залатая ліхаманка.
14.00, 23.00 Паездка ўлегцы.
16.00 Не спрабуйце паўтараць.
17.00, 5.30 Прыроджаны механік.
22.00 Футбол 360.
0.00, 2.00 Хуткія і гучныя.
2.55 Бітвы за кантэйнеры.
3.50 Рачныя монстры.

■ У лучнасці братняй

# У ПАКІСТАНЕ ВЕДАЮЦЬ ВАСІЛЯ БЫКАВА І СВЯТЛАНУ АЛЕКСІЕВІЧ



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Што мы ведаем пра Пакістан? Што мы ведаем пра пакістанскую літаратуру?.. Зразумела, зазірнуўшы ў інтэрнэт, можна па-руску і яшчэ болей па-англійску нешта адкрыць, можна сфарміраваць нейкія агульныя ўяўленні. Але хацелася б ведаць пра літаратуру з першых вуснаў... У лютым 2016 года Мінск наведаў спадар Касім БУГІА. Старшыня Пакістанскай акадэміі літаратуры, прафесар, ён быў госцем Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Пабываў і ў Выдавецкім доме «Звязда», дзе адбылася грунтоўная размова пра магчымае развіццё літаратурных стасункаў паміж Беларуссю і Пакістанам. Ёсць упэўненасць, што сапраўды многа што здзейсніцца. Пераконваюць у гэтым першыя крокі — у прыватнасці, часопіс «Полымя» надрукаваў толькі што падборку вершаў паэтаў Пакістана па-беларуску. А зараз — слова спадару Касіму Бугіа, які пагадзіўся адказаць на некалькі пытанняў.**

***— Што з відаў літаратуры цяпер дамінуе ў Пакістане: проза, паэзія, драматургія альбо публіцыстыка?***

— Пакістан мае багатую літаратурную спадчыну ў яе шматмоўнай разнастайнасці. Характар пакістанскай літаратуры ў спалучэнні спрадвечных містычных ведаў з сацыяльнымі і агульначалавечымі каштоўнасцямі акрэслены ўсімі асноўнымі мовамі народаў Пакістана: урду, пенджабі, сіндхі, пушту, белуджы, брагуі, сараікі і іншымі. Аўтары пішуць выдатныя літаратурныя творы ва ўсіх відах. Але сёння ў Пакістане дамінуюць раманы і апавяданні, паэтычныя творы — газелі і вершы.

***— Ці працуюць у вашай краіне пісьменніцкія саюзы, грамадскія аб'яднанні літаратараў?***

— У Пакістане — шмат літаратурных арганізацый, асацыяцый, аб'яднанняў. Сярод іх вылучаецца Пакістанская гільдыя пісьменнікаў, Хальк-э-Арбаб-э-Зоўг, Прагрэсіўны пісьменніцкі саюз Анджанан-э-Таракі-э-Пасанд-Мусаніфен, Сіндхі Адабі Соннат Пунджабі Парчар. Асобна працуюць арганізацыі, якія аб'ядноўваюць пісьменнікаў па мове, на якой яны пішуць. Напрыклад, існуюць аб'яднанні літаратараў пушту.

***— Ці шмат прафесійных пісьменнікаў у Пакістане, тых, хто жыве з літаратуры?***

— Як на мой погляд, у такім фармаце ніводны з пісьменнікаў Пакістана не можа лічыцца «прафесійным». Літаратурная праца ў нас не з'яўляецца высокааплатнай. Пісьменнікі, каб забяспечыць свой сацыяльны статус, банальна кажучы — каб пракарміць сябе, сваю сям'ю, павінны працаваць на іншых працоўных месцах, часам вельмі далёкіх ад літаратуры, мастацкага слова, кнігі. Хоць, няхай сабе і рэдкія, усё ж ёсць выключэнні. Згадаю некаторыя імёны «прафесійных» літаратараў: Мустансар Хусэйн Тарар, Абдуль Хусэйн, Алі Баба, Анвар Пірзада, Ахмед Надзім Касіні і іншыя. Якраз яны займаюцца выключна пісьменніцкай працай і прасоўваннем мовы і літаратуры ў грамадстве, у краіне.

***— Раскажыце, калі ласка, пра літаратурныя ўзнагароды Пакістана. Ці ёсць у вас свая «Нобелеўка»?***

— Для таго, каб стымуляваць плённую працу, заахвочваць развіццё мастацкай дасканаласці і спрыяць творчаму спаборніцтву, недзе з 1980—1981 гадоў мы прысуджаем літаратурныя ўзнагароды за лепшыя кнігі. А ў спіс лепшых кніг Пакістана штогод трапляюць творы, напісаныя на ўсіх мовах розных народаў нашай краіны. А яшчэ — кнігі, якія з дапамогай Пакістанскай акадэміі літаратуры перакладаюцца на англійскую.

Назаву хоць бы некаторыя... Прэмія «Баба-э-Урду Молві» Абдула Хака (гэтая адзнака — за працу на ўрду), прэмія «Аллама» доктара Мухамада Ікбала (за паэзію на ўрду). Узнагарода «Сайед» Варыса Шаха — за творы на пенджабі. Прэмія імя Шаха Абдула Лаціфі Бхіттаі — пісьменнікам, якія пішуць на мове сіндхі. Прэмія Кхваі Гхулама Фарыды — для пісьменнікаў сараікі. Прэмія Тай Мухамада Таджала — за творчасць на мове брагуі. Узнагарода Сайена Ахмада Алі — літаратарам хіндка. Прэмія імя Патрыма Батхары — за лепшую англамоўную кнігу. Ёсць прэмія — Музамада Хассана Аскары — за перакладчыцкую работу. Велічыня па грашах кожнай з гэтых прэмій складае 100 000 рупій, альбо 950 долараў ЗША.

Вельмі прэстыжная прэмія «Камаль-э-Фан». Яна заснавана ў 1997 годзе. Для ўзнагароджвання старэйшых пакістанскіх літаратараў: за дасягненні на працягу ўсёй шматгадовай работы ў нацыянальнай літартуры. Прэмію не прысуджаюць пасмяротна. Яе атрымліваюць пісьменнікі пры жыцці. Грашовая частка складае каля 500 000 рупій — гэта недзе 4 800 амерыканскіх долараў.

Прэмія імя Шаха Абдула Лаціфі Бхіттаі — мы яе ўжо згадвалі — прысуджаецца штогод за лепшую кнігу па суфізме.

***— Прызнацца, уражлівы пералік...***

— А ёсць жа яшчэ прэміі, якія заснаваны ў межах розных пісьменніцкіх аб'яднанняў. Усё гэта ў цэлым толькі на карысць літаратурнаму працэсу ва ўсёй краіне.

***— Сённяшні рытм жыцця патрабуе імгненнага выкладання пазіцыі, хуткага асэнсавання рэчаіснасці. У дадатак да працы па напісанні кніг пісьменнікі выступаюць у друку з публіцыстычнымі артыкуламі, вядуць калонкі ў газетах, блогі на інтэрнэт-сайтах. Пісьменнікі ладзяць актуальныя дыскусіі, удзельнічаюць у дыспутах і канферэнцыях. Якім чынам праяўляецца вось гэтая адмеціна сучаснага мастацкага жыцця ў Пакістане?***

— Пакістанская акадэмія літаратуры ладзіць нацыянальныя і міжнародныя канферэнцыі па розных тэмах, звязаных з мовай, літаратурай. У 1995 годзе мы правялі Міжнародную канферэнцыю пісьменнікаў і інтэлігенцыі. Такая ж канферэнцыя прайшла ў студзені 2013 года. У 2008 і 2010 гадах мы запрасілі прадстаўнікоў розных краін да ўдзелу ў Міжнародных канферэнцыях па суфізме.

Ёсць у нас добрая традыцыя ладзіць Мушаір — так у Пакістане і Паўночнай Індыі называюць сходы, дзе паэты шмат гадзін запар чытаюць свае вершы. Звычайна Мушаір мы спалучаем з канферэнцыяй на тую ці іншую тэму. Месцамі правядзення сумесных з Мушаірам канферэнцый мы абралі гарады Карачы, Лахор, Квету. Правялі і сумесны форум — у Лахоры. Адну з канферэнцый ПАК прысвяцілі правам жанчыны і адлюстраванню гэтай тэмы ў літаратуры.

***— Якія з замежных літаратур карыстаюцца найбольшым попытам у пакістанскіх чытачоў?***

— Па розных прычынах найбольш распаўсюджаная англійская літаратура. Галоўны складнік папулярнасці — у англійскай мове, якая з'яўляецца міжнароднай мовай навукі і тэхнікі. Вывучэнне англійскай сёння і для Пакістана і пакістанцаў — як магчымасць дыхаць. Без гэтага нельга дасягнуць розных мэтаў на глабальным узроўні. Вось чаму ў Пакістане адукацыя пабудавана так, што дзеці вывучаюць англійскую мову з самага ранняга ўзросту. Адпаведна, і англійская літаратура становіцца больш займальнай і зразумелай для людзей, карыстаецца шырокай увагай.

***— Дзякуючы знаёмству з вамі мы адкрылі для сябе літаратурны альманах Паўднёва-Азіяцкай асацыяцыі рэгіянальнай кааперацыі (SAARC). Як актыўна наладжана супрацоўніцтва пісьменнікаў у межах гэтага інтэграцыйнага руху?***

— Пісьменніцкая арганізацыя краін SAARC толькі-толькі зараджаецца. Мы ўсе вядзём работу над умацаваннем культурных сувязяў з дапамогай літаратурных і культурных узаемадачыненняў паміж краінамі SAARC. Выступаем за мір і спакой у рэгіёне, заклікаем людзей да дыялогу ў вырашэнні спраў.

***— Ці працуюць пісьменнікі ў Пакістане на ніве мастацкага перакладу?***

— Канешне ж, у нас шмат перакладаюць з іншых моў. Гэта і мае калегі з ПАЛ, і пісьменнікі з іншых урадавых і няўрадавых арганізацый.

***— Наколькі знаёмыя пакістанцы з рускай літаратурай?***

— Мажліва, намнога менш мы ведаем сучасную рускую літаратуру. Затое добра знаёмыя з класікай. Найперш — з творамі Міхаіла Булгакава, Фёдара Дастаеўскага, Льва Талстога, Максіма Горкага і Расула Гамзатава...

***— Апошні з вамі названых — аварскі паэт з Дагестана, хоць, канешне ж, ён — з пісьменнікаў Расійскай Федэрацыі.***

— І, пэўна ж, перакладзены ў нас з рускай мовы. Зразумела, што рускую літаратуру мы чытаем не толькі на ўрду і іншых мовах Пакістана, але і на англійскай.

Добра вядомы ў Пакістане і рускі пісьменнік Антон Паўлавіч Чэхаў. У 2010 годзе Рускі культурны цэнтр у Карачы ў супрацоўніцтве з Нацыянальнай акадэміяй тэатральнага мастацтва паставіў п'есу А. Чэхава «Прапанова». Дарэчы, Рускі культурны цэнтр ёсць і ў Лахоры — ён заснаваны ў 2010 годзе ўніверсітэтам Пенджабі.

***— Будзем спадзявацца і на стварэнне Беларускага культурнага цэнтра.***

— Чаму б і не?! Пабываўшы ў Беларусі, Мінску, я зразумеў, наколькі беларуская літаратура багатая і самастойная. А значыць — вартая.

***— У свой час у Савецкім Саюзе быў добра вядомы пакістанскі пісьменнік Фаіз Ахмад Фаіз...***

— Так. Пакістанскі драматург, празаік і паэт быў узнагароджаны Міжнароднай Ленінскай прэміяй. Многія яго творы былі перакладзены на рускую мову. Добра вядомы ў Расіі, СССР быў і наш драматург і сцэнарыст Анвар Максуд. Большасць яго п'ес была перакладзеная і пастаўленая ў тэатрах Расіі.

***— Ці ведаюць у Пакістане каго з беларускіх пісьменнікаў? Як, напрыклад, Васіля Быкава, Святлану Алексіевіч...***

— Мы чулі гэтыя імёны. Яны, несумненна, вядомыя ў нашым літаратурным асяроддзі. Пакістанскія штодзённыя газеты згадвалі пра іх у сваіх навінах.

**Гутарылі Адам ШОСТАК, Сяргей ШЫЧКО.**

*Мінск — Ісламабад.*

■ Неасабісты суб'ектыў



# ПРАВІЛЫ ДОБРАГА ТОНУ

## Пра нязручныя туфлі, пустыя крамы і прынцып «трэба будзе — вас паклічуць»

Вам, як добрым знаёмым, паскарджуся: абула сёлета першы раз свае любімыя туфлі, а яны зноў ногі намулялі. Прыгажосць патрабуе ахвяр — што тут яшчэ скажаш. Але гэта не мой выпадак, бо тут не столькі ў прыгажосці справа, колькі ва ўдалым маркетынгу, ахвярай якога ваша пакорная слуга і стала.

Туфлі гэтыя — на абцасах, з элегантнымі высокімі замшавымі заднікамі, колеру залацістай кавы, я ўгледзела ў вітрыне аднаго з буцікаў у цэнтры Страсбурга. Разумеючы, што таннымі яны не будуць, усё ж асмелілася зайсці паглядзець. Прадавец, які лянiва чытаў за касай газету, прыветліва ўсміхнуўся, сказаў дзяжурнае «банжур» і зноў у чытанне паглыбіўся. «Ну і сэрвіс! — падумалася. — Вось табе і Францыя!». Соваючыся па магазіне, я ўсяляк старалася прыцягнуць яго ўвагу да сваёй персоны: перагледзела ўжо ўвесь абутак, і ў рукі тыя туфлі ды чаравікі брала, і разглядала ўважліва, і ледзьве не нюхала. Безвынікова — хлопец толькі зрэдку падымаў ад газеты вочы і ўсміхаўся. Але калі я на сваёй ламанай французскай папрасіла яго даць мой памер тых, заваблівых, з вітрыны — прадаўца як падмянілі. «Мадам, мадам...» — ён хуценька, але не мітусліва прынёс зручнае крэсла, не даў нават разуцца самой — далікатна зняў з ног старыя туфлі, абуў новыя, клапатліва пытаючы, ці зручна, ці не цісне... Ашаломленая такім абыходжаннем, «мадам» была задаволеная абсалютна ўсім, а рука ўжо сама працягвала ветліваму хлопцу картку для аплаты. Мала таго, я яшчэ нібы пад гіпнозам купіла дадаткова налепкі на падэшвы за восем еўра (знасіліся пасля за тыдзень). Патрэбны яны мне былі, як казе тыя ж туфлі, але як можна было адмовіць такому абаяльнаму маладому чалавеку (ды яшчэ і французу!).

У еўрапейскіх магазінах гэта стала тэндэнцыяй апошняга часу — не кідацца з парога да патэнцыяльнага пакупніка, не лезці яму ў вочы з прапановай кшталту «Можа, вам што падказаць?» Сучасныя спажыўцы дасведчаныя, яны або ведаюць дакладна, чаго менавіта хочуць, або робяць выбар, прычым выбар самастойны, на месцы, або заходзяць «проста паглядзець». Абслуговы ж персанал навучаны цяпер дзейнічаць па прынцыпе «Трэба будзе — мяне паклічуць». І ўжо калі паклічуць, тады і варта праяўляць усю сваю абаяльнасць, дасведчанасць, уважлівасць...

Што ні кажыце, маркетынг — сапраўдная навука. І яе асноўнае правіла — мабільнасць і ўменне хутка мяняцца ў залежнасці ад рэчаіснасці. Вось якраз з гэтым у нашага гандлю вялікія праблемы. Пакуль нашы прадаўцы вучыліся вітацца, усміхацца і старацца папярэджваць любое жаданне пакупніка (урок той засвойваўся доўга, з грымасамі і скрыгатам зубоў), гэты самы пакупнік паспеў змяніць свае прыярытэты. Нікому сёння не патрэбны дзяжурныя словы і назойлівы сэрвіс (які яшчэ пару дзесяцігоддзяў назад лічыўся найлепшым тонам). Толькі калі наша непаваротлівая машына маркетынгу павернецца ў гэтым напрамку?

Вось прызнайцеся шчыра: вы калі-небудзь заходзіце ў фірменныя дарагія магазіны, якіх у сталіцы, дый у буйных гарадах, хапае. Я асабіста — ніколі, бо ведаю, што ад дзвярэй наляцяць даўганогія дзяўчаты са сваім вечным: «Што вам падказаць?» А нічога! Я проста так гуляю і паглядзець зайшла. Будзе трэба — вас паклічуць. Але ж яны не адыходзяцца і, калі ўбачаць, што ты ні да чога не прыцэньваешся, пачнуць пазіраць на цябе з падазронасцю, а пасля і з пагардай. І ты выходзіш з гэтага буціка з сапсаваным ушчэнт настроем і комплексам непаўнавартасці, незалежна ад наяўнасці грошай у кашальку. Знаёмае адчуванне, праўда? І не сказаць, каб прыемнае. Думаю, менавіта з-за яго нашы бліскучыя, прыгожыя, духмяныя магазіны ўвесь час стаяць пустыя і вельмі хутка мяняюць назвы. Арэнда памяшканняў дарагая, з чаго яе плаціць, калі няма выручкі? Адны з'язджаюць, другія засяляюцца. Ненадоўга, бо пра тое, каб памяняць падыходы да пакупнікоў, задумваюцца нямногія.

Ёсць у айчыннай маркетынгавай тэме і іншы бок медаля. Гіпермаркеты, якія з-за вялікага абароту і адноснай таннасці тавараў дэфіцыту ў наведвальніках і пакупніках не адчуваюць. Тут прынцып «Будзе трэба — вас паклічуць» таксама не спрацоўвае, праўда, па-іншаму: можаш паўгадзіны безвынікова клікаць і ўрэшце сутыкнуцца з непрабівальнай абыякавасцю. У нашым прадуктовым гіпермаркеце, напрыклад, каб узважыць штосьці з замарожаных прадуктаў, трэба стаяць каля вагі і гукаць на ўвесь магазін. Хвілін праз дзесяць да вас падыдзе-такі прадавачка з такім выразам на твары, што пачынаеш адчуваць сябе прычынай усіх яе жыццёвых непрыемнасцяў... А знаёмы расказваў нядаўна, як спрабаваў у вялікім будаўнічым магазіне купіць разетку для тэлефона. Звярнуўшыся да кансультанта (а яны там у кожным аддзеле па некалькі чалавек стаяць, маладыя, у фірменным адзенні) па параду, пачуў у адказ: «Глядзіце самі, я не абавязаны ўсім разеткі выбіраць»....

Абураны знаёмы цяпер хоча скаргу на сайце магазіна напісаць. «Трэба ж навучыць манерам», — аргументуе. Зрэшты, і без яго і абыякава-няветлівых, і ветліва-назойлівых хутка гэтым правілам навучыць канкурэнт, які ўжо і так пачынае на пяты наступаць. Інтэрнэт-крамы. Тут табе і неабмежаваны прастор для «проста паглядзець», і любы капрыз у дастаўцы, і магчымасць памераць і адмовіцца, калі не падышло, і ветлівыя кур'еры, і прываблівая цана, і магчымасць купіць тое, што трэба, не ўстаючы з канапы...

І ўсё ж тыя туфлі я б па інтэрнэце не заказвала. Прыгожыя яны, вядома, але і цана кусаецца, і калодка не вельмі зручная, і абцас высакаваты... Калі шчыра, я ўсё гэта і ў краме выдатна разумела. Але ж які абыходлівы быў той француз!.. Што ні кажыце, маркетынг — навука сур'ёзная.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

## ООО «Юридическая компания Аспект» проводит первые ОТКРЫТЫЕ ТОРГИ в форме аукциона по продаже имущества ООО «МОДЕРАТО», находящегося в процедуре ликвидации

| № лота | Наименование лота | Кол-во, шт. | Начальная цена 1 ед. лота (без НДС), руб. | Шаг торгов, руб. | Задаток для участия в торгах, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Буровая установка 1БА15К на шасси МАЗ 5337 1989 г.в. с к-том буров. инстр-та. (224,2 м) и ротором-приставкой Р410 | 1 | 399 000 000 | 19 950 000 | 39 900 000 |
| 2 | Буровая установка УГБ - 3УК | 1 | 59 800 000 | 2 990 000 | 5 980 000 |
| 3 | Воздушн.- компрессорн. станция ДК- 9М | 1 | 20 344 500 | 1 017 225 | 2 034 450 |
| 4 | Домкрат гидравлический г.п. 65тн | 2 | 1 779 000 | 88 950 | 177 900 |
| 5 | Сварочный аппарат АДД-400141 | 1 | 14 900 000 | 745 000 | 1 490 000 |
| 6 | Емкость металлическая | 1 | 4 449 400 | 222 470 | 444 940 |
| 7 | Автомобиль KAMAZ 5320 (с гидроманипулятором) 1990 г.в. | 1 | 126 000 000 | 6 300 000 | 12 600 000 |
| 8 | Прицеп бортовой (зеленый) на шасси Маз 8925 1989 г.в. с компрессором ПВ-10 | 1 | 62 000 000 | 3 100 000 | 6 200 000 |
| 9 | Прицеп бортовой (серый) на шасси Маз 8925 1989 г.в. | 1 | 15 300 000 | 765 000 | 1 530 000 |
| 10 | Аэродромная поливомоечная машина (АКПМ-3) на шасси ЗИЛ 130 | 1 | 49 500 000 | 2 475 000 | 4 950 000 |

| | |
|---|---|
| **Продавец:** | **ООО «МОДЕРАТО»** |
| **Организатор торгов:** | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| **Место проведения торгов:** | **г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 6, оф. 20 (минус 1 этаж)** |
| **Дата и время проведения торгов:** | **20.06.2016 в 11.00** |
| **Срок подачи заявок:** | **по 16.06.2016 до 18.00** |
| **Порядок подачи заявок:** | принимаются организатором торгов по месту проведения торгов либо по адресу: 220050, г. Минск, а/я 85 |
| **Срок внесения задатка:** | по 16.06.2016 |
| **Реквизиты для оплаты задатка:** | **Получатель – ООО «МОДЕРАТО»** р/с 3012207240017 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, код 739, УНП 100159037 |

**Условия торгов:**

• к участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке;
лицо, желающее участвовать в торгах, представляет с заявлением оригинал платежного документа, подтверждающего внесение на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА, указанный в настоящем извещении, суммы задатка (задатков), с отметкой банка. При личном обращении заявитель (представитель) предъявляет оригинал документа, удостоверяющего личность. Дополнительно организатору торгов представляются:
- юридическом лицом: копия последней редакции устава и свидетельства о государственной регистрации вместе с их подлинниками для заверения копий организатором аукциона, доверенность на представителя или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; юридическим лицом, иной организацией (нерезидентом РБ): копии учредительных документов вместе с выпиской из торгового реестра страны их учреждения (выданной не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иным равнозначным доказательством юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения, доверенность на своего представителя, легализованные в установленном порядке, с нотариально удостоверенным переводом на русский язык;
- индивидуальным предпринимателем: копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;
- представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя: нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя (нерезидентов Республики Беларусь): легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;
• победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;
• заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов;
• победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретение предмета торгов;
• победитель торгов оплачивает цену лота **с учетом НДС 20%**, за вычетом суммы внесенного задатка, в течение 10 (десяти) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи;
• в случае отказа (уклонения) победителя торгов, единственного участника торгов от подписания протокола о результатах торгов, возмещения затрат на организацию и проведение торгов, подписания договора, а также в иных случаях, предусмотренных актами законодательства, внесенный этим участником задаток возврату не подлежит;
